М. А. Шкуратава, Ю. А. Лукашэвіч

# ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА 4











М. А. Шкуратава, Ю. А. Лукашэвіч

# ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА

Вучэбны дапаможнік для 4 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання

Для работы ў класе

*Дапушчана Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

Мінск
«Адукацыя і выхаванне»
2018

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

УДК 73/76(075.2=161.3)
ББК 85.103я72
Ш67

Пераклад з рускай *М. М. Шавыркінай*

Рэцэнзенты: кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт, загадчык аддзела старажытнабеларускай культуры дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» *Б. А. Лазука*; метадычнае аб'яднанне настаўнікаў выяўленчага мастацтва дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 150 г. Мінска» (настаўнік выяўленчага мастацтва і працоўнага навучання вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі *Н. А. Дзягель*)

**Шкуратава, М. А.**
Ш67 Выяўленчае мастацтва : вучэб. дапам. для 4-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання : для работы ў класе / М. А. Шкуратава, Ю. А. Лукашэвіч ; мастак А. М. Новікаў. — Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2018. — 192 с. : іл.
ISBN 978-985-7191-81-9.

УДК 73/76(075.2=161.3)
ББК 85.103я72

ISBN 978-985-7191-81-9

© Шкуратава М. А., Лукашэвіч Ю. А., 2018
© Шавыркіна М. М., пераклад на беларускую мову, 2018
© Афармленне. РУП «Выдавецтва "Адукацыя і выхаванне"», 2018

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Дарагія чацвёртакласнікі!

Па гэтым вучэбным дапаможніку вы працягнеце знаёміцца з выразнымі сродкамі розных відаў выяўленчага мастацтва. На яго старонках вы знойдзеце інфармацыю пра тое, як выконваць кампазіцыі рознымі мастацкімі матэрыяламі.

Навучыцца аналізаваць ілюстрацыі вам дапамогуць умоўныя абазначэнні. Яны пазначаюць спосабы вырашэння выяўленчых задач (форма, прапорцыі, кампазіцыя, колер). Як вырашаюцца гэтыя задачы, павінен ведаць нават мастак-пачатковец. Дзякуючы набытым навыкам вы зможаце раскрыць сакрэты стварэння любога мастацкага твора.

Смела адкрывайце для сябе цудоўны свет мастацтва! Вучыцеся маляваць, ляпіць, канструяваць, бачыць усё вачыма сапраўднага мастака. І тады на творчым шляху ў вас не будзе ніякіх перашкод.

*Аўтары*



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## ЗМЕСТ


**1. ПРЫГАЖОСЦЬ НАВАКОЛЬНАГА СВЕТУ** ........ 7
Сучаснае аблічча гарадоў і вёсак Беларусі ......... 10

**2. ЧАРОЎНЫ СВЕТ МАСТАЦТВА** ........ 12
Свет мастацкіх інтарэсаў чалавека ........ 12
Віды выяўленчага мастацтва ........ 13
Мастацтва графікі ........ 16
Мастацтва жывапісу ........ 25
Мастацтва скульптуры ........ 29
Жанры выяўленчага мастацтва ........ 33
Мастацтва архітэктуры ........ 51
Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва ........ 54

**3. МАЙСТЭРСТВА СТВАРЭННЯ МАСТАЦКІХ ВОБРАЗАЎ** ........ 57
**Шматаблічны свет мастацкіх вобразаў** ........ 57
**Школа мастацтва** ........ 62
Адлюстраванне агародніны, садавіны, прадметаў побыту ........ 62
Адлюстраванне дрэў, будынкаў, транспартных сродкаў ........ 69
Адлюстраванне жывёл ........ 76
Адлюстраванне чалавека ........ 87
Адлюстраванне групы людзей у руху ........ 91
Адлюстраванне партрэта ........ 97
**Сакрэты майстэрства** ........ 102
Дэкарыраванне прадметаў побыту ........ 102
**Таямніцы кавалачка гліны** ........ 105
Лепка рэльефу ........ 105
Лепка аб'ёмных аб'ектаў ........ 108

**4. СВЕТ МАСТАЦКІХ ТЭХНІК** ........ 112
**Дзівосны свет мастацкіх тэхналогій** ........ 112




Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Аплікацыя ........................................ 112
Трафарэт ........................................ 122
Манатыпія ........................................ 123
**Загадкавы свет кропак, ліній і плям** ............... 125
Выкананне нацюрморта (графітны аловак) ..... 125
Выкананне пейзажа (графітны аловак) ........... 128
**Прывабны свет колеру, святла і ценяў** ........... 131
Выкананне нацюрморта ў тэхніках «акварэль» і «гуаш» ................................ 131
Выкананне пейзажа ў тэхніках «акварэль» і «гуаш» ........................................ 136
Выкананне шматпланавых сюжэтных кампазіцый у тэхніцы «гуаш» .................. 141
**Таямнічы свет формаў, пластыкі і аб'ёму** ....... 146
Выкананне скульптурнага рэльефу ................ 146
Выкананне аб'ёмных скульптурных кампазіцый ........................................ 148
**Чароўны свет ажурных узораў** ...................... 151
Выцінанка ........................................ 151
**Захапляльны свет цацак-самаробак і сувеніраў** ........................................ 156
Выкананне рэльефных кампазіцый .............. 156
Выкананне падвесных канструкцый .............. 160
Выкананне аб'ёмных цацак ........................ 163

**5. АСНОВЫ КОЛЕРАЗНАЎСТВА** ..................... 174
Колеравы круг ........................................ 174
Гарманічнае спалучэнне колераў.................. 177
Спосабы афарбоўкі паперы ........................ 179

**Слоўнік мастацкіх тэрмінаў і паняццяў** ........................................ 183



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Умоўныя абазначэнні

**Да тэкставага матэрыялу дапаможніка:**

– вазьміце інфармацыю на заметку

– парады мастакоў

* – звярніцеся да слоўніка мастацкіх тэрмінаў і паняццяў

**Да ілюстрацыйнага матэрыялу дапаможніка:**

– звярніце ўвагу на форму, прапорцыі і канструкцыю прадмета (аб’екта)

– звярніце ўвагу на кампазіцыйнае вырашэнне твора

– звярніце ўвагу на колеравае (тонавае) вырашэнне выявы (кампазіцыі)

– звярніце ўвагу на прыёмы малявання (вырэзвання, лепкі)

– звярніце ўвагу на асаблівасці выканання вырабу (кампазіцыі)

– падумайце пра практычнае выкарыстанне вырабу (кампазіцыі)

– звярніцеся да рэсурсу: http://e-vedy.adu.by



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# 1. ПРЫГАЖОСЦЬ НАВАКОЛЬНАГА СВЕТУ

Якая цудоўная наша планета! Калісьці на Зямлі не было жывых істот. Праходзілі тысячагоддзі, паступова на ёй з'яўляліся расліны і жывёлы. Яны прыстасоўваліся да ўмоў навакольнага асяроддзя. Клапоцячыся пра сваё патомства, жывёлы ладзілі гнёзды, рылі норы, будавалі бярлогі. Першабытны чалавек пасяліўся ў пячорах. Пячоры доўгі час хавалі людзей ад холаду і спёкі, дажджоў і вятроў. Пазней чалавек навучыўся будаваць сабе жыллё з травы, галін дрэў і гліны. Гэтыя матэрыялы выкарыстоўвалі птушкі і звяры для будаўніцтва гнёздаў, норак, хатак. Але толькі чалавек вырабляў і выкарыстоўваў розныя прылады працы. Калі людзі навучыліся здабываць і падтрымліваць агонь, з'явіўся першы гліняны посуд. Збаны, місачкі і кубачкі, абпаленыя на агні, былі трывалымі, прыгожымі і лёгкімі.

З тых часоў мінула шмат тысячагоддзяў. Чалавек навучыўся вырабляць трывалы будаўнічы матэрыял – цэглу і бетонныя пліты. З халодных пячор, сырых зямлянак і цёмных хат людзі паступова перасяліліся ва ўтульныя дамы. Будаўнічай справе нашы продкі вучыліся ў старэйшых членаў роду. Атрыманыя ад іх веды захоўвалі, набывалі новыя і перадавалі наступнаму пакаленню. Так наша зямля ператварылася ў казачны свет – утульны дом для кожнага.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Кожны архітэктурны аб’ект мае сваё прызначэнне. Гэта жылыя будынкі, масты, вакзалы, спартыўныя стадыёны. Людзі ўзводзяць новыя збудаванні і захоўваюць старажытныя архітэктурныя пабудовы. Пры неабходнасці рэстаўруюць* гістарычныя і значныя ў мастацкім плане збудаванні, якія вылучаюцца выразнасцю формаў і дасканаласцю прапорцый. Іх прыгажосць змяняе навакольны свет.

Да нашых дзён захаваліся некаторыя створаныя шмат стагоддзяў таму архітэктурныя збудаванні. Іх веліч і талент старажытных дойлідаў* і сёння дзівяць нас.



Участак Вялікай Кітайскай сцяны Муцяньюй

1



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Піраміда Джосера ў Сакары. 2667—2648 гады да н. э.

2



Спаса-Праабражэнская царква. Полацк. 12 стагоддзе

3



Уваскрасенская царква. Віцебск. 18 стагоддзе

4



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Сучаснае аблічча гарадоў і вёсак Беларусі

Драўляныя пабудовы недаўгавечныя. Больш трывалымі лічацца будынкі з каменю, цэглы і бетону. У беларускіх вёсках жылыя дамы будуюць пераважна з цэглы. Для будаўніцтва шматпавярховых будынкаў у гарадах выкарыстоўваюцца бетон, шкло і метал.

Выбар матэрыялаў для будаўніцтва архітэктурных збудаванняў залежыць ад іх прызначэння. Для спартыўных палацаў выкарыстоўваюцца метал і шкло. У доме з бетону і цэглы будзе цёпла і ўтульна гараджанам. Важна, каб будынкі выконвалі свае функцыі і былі прыгожымі.

Сучасныя тэхналогіі дазваляюць архітэктарам рэалізаваць самыя смелыя праекты. Таму кожны населены пункт Беларусі мае сваё непаўторнае аблічча.

5



Дом культуры ў Міхалкоўскай Рудні, Мазырскі раён Гомельскай вобласці



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



6

Шматпавярховы жылы дом у Мінску

Старажытныя і сучасныя архітэктурныя збудаванні ўпрыгожваюць навакольны свет і становяцца своеасаблівай візітнай карткай краіны, дзе яны знаходзяцца. Згадваючы Егіпет, мы ўяўляем велічныя піраміды. Калі кажуць пра Кітай, у многіх з'яўляецца жаданне ўбачыць Вялікую Кітайскую сцяну. Распавядаючы пра Беларусь, мы абавязкова згадаем аб архітэктурных асаблівасцях Нацыянальнай бібліятэкі.

**Заданне.** Разгледзьце ілюстрацыі 1–6. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**Пытанні.** **1.** Чаму ў наш час архітэктары могуць рэалізаваць самыя складаныя праекты?

**2.** Якія помнікі архітэктуры ёсць на тэрыторыі вашага рэгіёна? Як наша дзяржава і вы клапоціцеся аб іх захаванасці?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# 2. ЧАРОЎНЫ СВЕТ МАСТАЦТВА

## Свет мастацкіх інтарэсаў чалавека

Інтарэсы чалавека шматгранныя і living рознабаковыя. Яны ўплываюць на выбар прафесіі, вызначаюць хобі[1] людзей. Мастацкія інтарэсы школьнікаў – гэта замалёўкі або фатаграфаванне прадметаў, якія маюць эстэтычную каштоўнасць.

Вялікую цікавасць у аднакласнікаў могуць выклікаць вашы фота- або мастацкія выставы. Іх тэматыка можа быць любая. Галоўнае – паказаць незвычайныя здымкі ці замалёўкі. І тады вашы работы прыцягнуць увагу іншых. На сваёй выставе вы можаце быць экскурсаводам* ці мастацтвазнаўцам*. Колькі цікавай інфармацыі змогуць даведацца ад вас вашы сябры!

Часта захапленне становіцца неад’емнай часткай прафесіі чалавека. Ён дасягае творчых вяршынь, а наша павага да яго перарастае ў зачараванне.

Свет мастацкіх інтарэсаў чалавека – гэта кіно, тэатр, выяўленчае і музычнае мастацтва. Нас перапаўняюць эмоцыі пры праглядзе кінафільма, наведванні выставы, праслухоўванні музыкі. З’яўляюцца цікавасць да прафесіі артыста, кампазітара ці мастака і непераадольнае жаданне паспрабаваць сябе ў такой дзейнасці. Гэта дапамагае зразумець, што больш за ўсё па душы.

[1] Хобі – захапленне; любімы занятак у вольны час, для сябе.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



1



2

## Віды выяўленчага мастацтва

Выяўленчае мастацтва – самае старажытнае з усіх відаў мастацтва. Літаратура, музыка, тэатр, кіно ўзніклі пазней. Літаратура, музыка і выяўленчае мастацтва з'яўляюцца асновай для іншых відаў мастацтва.

1



Сцэна са спектакля «Паўлінка».
Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

2 

Ансамбль «Песняры»

Немагчыма ўявіць спектакль, выступ артыстаў эстрады і цырка без музыкі і дэкарацый. Верагодна, у будучыні нельга будзе стварыць новы від мастацтва без гуку, слова, выявы.

**Пытанні. 1.** Якія віды мастацтваў з'яўляюцца асновай для іншых?

**2.** Якія, на ваш погляд, новыя віды мастацтва могуць з'явіцца ў 21 стагоддзі? Абгрунтуйце свой адказ.

### Калі пачалася гісторыя выяўленчага мастацтва?

Выяўленчае мастацтва зарадзілася тады, калі чалавек выканаў першы малюнак. Выявы на сцяне пячоры былі далёкія ад дасканаласці. Але майстэрства першабытнага чалавека з часам расло. Малюнкі, якія захаваліся, дзівяць дакладнасцю перадачы прапорцый і руху аб'ектаў. Выявы людзей і жывёл у сцэнах палявання ўмоўныя, але ярка перадаюць атмасферу таго, што адбываецца.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

3 

Фрагмент наскальнай выявы
ў пячоры Вальторта, Іспанія

**Пытанні.** **1.** Як, на вашу думку, развівалася выяўленчае мастацтва ў першабытным грамадстве?

**2.** Як вы лічыце, што дапамагала першабытнаму чалавеку дакладна перадаваць прапорцыі і рух выяўленых аб'ектаў?

**3.** Якія матэрыялы выкарыстаў першабытны чалавек для выканання малюнкаў?

## На якія віды падзяляюцца творы выяўленчага мастацтва?

У цяперашні час творы выяўленчага мастацтва падзяляюцца на віды і жанры.

Да відаў выяўленчага мастацтва адносяцца: **графіка, жывапіс, скульптура**. Кожны з гэтых відаў мастацтва падзяляецца на жанры і мае свае выразныя сродкі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Мастацтва графікі. Мастацкія асаблівасці чорнага і белага колераў

**Графіка** – мастацтва стварэння мастацкіх вобразаў з дапамогай чорнага і белага колераў.

Галоўныя выразныя сродкі графікі – **кропка, лінія, штрых, пляма, колер (тон).**

У стварэнні твора графікі можа ўдзельнічаць толькі адзін чорны колер. Графітны аловак або чорная туш і белы аркуш паперы – гэта ўсё, што трэба мастаку-графіку. Таму творы графікі часта называюць мастацтвам чорнага і белага. Мастацкія магчымасці двух колераў (чорнай фарбы і белай паперы) неабмежаваныя.

Графічныя работы ствараюцца з дапамогай ліній, штрыхоў, плям і тону. Пры выкананні адных твораў могуць выкарыстоўвацца штрыхі ці кропкі. Другіх – усе выяўленчыя элементы. Колер можа ўжывацца, але ён мае дапаможную ролю.

Пры стварэнні графічных кампазіцый выкарыстоўваюцца белая папера і чорная фарба (туш, графітны аловак). Ужываючы адзін колер, мастак можа намаляваць партрэт, нацюрморт, пейзаж або стварыць тэматычную кампазіцыю.

Сучасныя мастакі-графікі выкарыстоўваюць не толькі чорную фарбу і белы колер паперы. Пры стварэнні графічных кампазіцый яны ўжываюць розныя па колеры матэрыялы (фарбу, паперу).


Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Уладзімір Басалыга.
Касцёл у Ішкальдзі.
1992



Валерый Славук. Ілюстрацыя
да казкі «Пілiпка-сынок».
1997

1

2

Да твораў графікі адносяцца графічныя малюнкі і ўсе віды гравюры. Малюнкі выконваюцца графітнымі і каляровымі алоўкамі, фламастарамі, тушшу, вугалем, пастэллю, сангінай.

Графічныя малюнкі з’яўляюцца самастойнымі творамі мастацтва. Але могуць быць і падрыхтоўчым матэрыялам для жывапісных работ. У творчай дзейнасці мастака малюнак і жывапіс існуюць непарыўна.

Алоўкавыя накіды і замалёўкі могуць выкарыстоўвацца як зыходны матэрыял для выканання гравюры.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Гравюра** – від графікі, творы якога ўяўляюць з сябе адбіткі з друкарскай формы (матрыцы*).

Адбіткі атрымліваюць з дошак-пласцін на друкарскіх станках. Дошкі-пласціны называюцца друкарскімі формамі. Формы робяць з драўляных, пластыкавых і металічных загатовак. Спецыяльнымі прыладамі на іх паверхні выразаюць або прадрапваюць малюнак. Потым падрыхтаваныя формы выкарыстоўваюцца для тыражавання малюнка. Для каляровай гравюры выразаецца некалькі дошак. Для кожнага колеру малюнка патрэбна асобная дошка.

Часам дошкі выразаюць не самі мастакі-графікі. Па іх малюнках друкарскія формы выробляюць майстры-гравёры*. Але ўсе атрыманыя адбіткі лічацца аўтарскімі творамі.

Творы гравюры падзяляюцца на віды. Гэта гравюра на ліналіуме (лінагравюра*), гравюра на кардоне, гравюра на дрэве (дрэварыт, ксілаграфія), гравюра на метале (афорт*) і іншыя.

### Лінагравюра

Лінагравюра – адбітак, атрыманы з выразанай на лінолеуме выявы. Лінагравюра з'явілася на мяжы 19–20 стагоддзяў з вынаходствам лінолеуму. Малюнак на друкарскай форме выразаецца разцамі рознай велічыні. Потым форму пакрываюць друкарскай фарбай пры дапамозе валіка. Выконваюць пробны адбітак і карэктуюць малюнак. Выява



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

можа выпраўляцца некалькі разоў. Калі гравюра становіцца найбольш выразнай, друкуюць неабходную колькасць экзэмпляраў.

Лінолеум не абмяжоўвае мастака ў выбары памеру гравюры. А мяккасць матэрыялу дазваляе параўнальна хутка падрыхтаваць друкарскую форму. Лінолеум лёгка прадрапваецца і праразаецца на любую глыбіню. Ён самы прыдатны матэрыял для атрымання шматколерных гравюр. Таму лінагравюра прыцягвае многіх майстроў друкаванай графікі.

3



Мікалай Дучыц. Стагі. 1966

## Гравюра на кардоне

Тэхналагічны працэс выканання гравюры на кардоне даволі просты. Гэты від гравюры даступны нават мастакам-пачаткоўцам.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Рэльефная форма для друку выпрацоўваецца з кардону рознай шчыльнасці. З дапамогай аплікацыі складаюцца асобныя элементы. Штрыхі на іх праразаюцца нажом або прадрапваюцца іголкай.



4

Ірына Вараб'ёва. Гарачая пара сенакосу. 1969

Мастацкія магчымасці гравюры на кардоне вельмі абмежаваныя. Таму яна не атрымала шырокага распаўсюджвання сярод прафесійных мастакоў.

## Гравюра на дрэве (дрэварыт, ксілаграфія)

Дрэварыт – гравюра на драўлянай дошцы. Малюнак выразаецца спецыяльнымі разцамі. Фарба накатваецца валікам на плоскасць



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

зыходнай дошкі. Пры друку на паперы белымі застаюцца ўчасткі, выразаныя разцом. Адбіткі ўяўляюць з сябе малюнкі з выразна вылучанымі выявамі або контурамі аб’ектаў. У Еўропе дрэварыт з’явіўся ў Сярэднявеччы ў сувязі з развіццём кнігадрукавання.



5

Ганна Астраумава-Лебедзева.
Група дрэў каля Белай Бярозы. 1923

## Гравюра на метале

Гравюра па метале выконваецца на цынку, медзі, жалезе, сталі. Існуе вялікая колькасць тэхнік гэтага віду гравюры. Адной з іх з’яўляецца **афорт**. Металічную пласціну пакрываюць слоем спецыяльнага лаку. Потым прадрапваюць малюнак гравіравальнай іголкай. Прадрапаныя месцы пратраўліваюць кіслатой. Атрыманую паглыбленую выяву запаўняюць фарбай. Зараз з матрыцы



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

можна атрымаць адбітак. Фарба на яе наносіцца кожны раз, калі трэба аддрукаваць малюнак (гравюру).



Бюро гравіроўкі і друку (ЗША). Высадка Калумба. Фрагмент. 1875

6

**Манатыпія**

Самым простым па выкананні відам гравюры з’яўляецца манатыпія. Гісторыя гэтага віду друкаванай графікі пачынаецца з сярэдзіны 17 стагоддзя.

Тэхніка манатыпіі заключаецца ў нанясенні фарбаў ад рукі на гладкую паверхню друкарскай формы. Атрыманы з яе адбітак заўсёды бывае адзіным і ўнікальным. Часам мастаку не ўсе гато-


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

вые адбіткі падабаюцца. І ён адбірае тыя работы, якія маюць эстэтычную прывабнасць. Часта адбіткі дапрацоўваюцца ўручную. І тады ў кампазіцыю ўводзяцца дадатковыя выяўленчыя элементы. Такія работы маюць сюжэтную канву (аснову) і прыцягваюць тонкасцю колеравых спалучэнняў.

Тэхніка манатыпіі часта выкарыстоўваецца ў спалучэнні з іншымі графічнымі тэхнікамі.

7



Джавані Бенедэта Кастыльёнэ. 1655



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



8

Эдгар Дэга. Пшанічнае поле і зялёны пагорак.
Пастэль па манатыпіі. 1890–1892

Графічныя малюнкі і гравюры могуць упрыгожыць інтэр’ер любога памяшкання.

**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 1–8. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Раскажыце пра асаблівасці падрыхтоўкі друкарскіх формаў і атрымання адбіткаў (гравюр).

**Пытанні.** **1.** Што выкарыстоўваюць у якасці загатовак для друкарскіх формаў?

**2.** Як называюць адбітак, атрыманы з загатоўкі на драўлянай дошцы?

**3.** Як называюць гравюру, атрыманую з рэльефнай выявы на лінолеуме?

**4.** Як называюць адбітак, атрыманы з металічнай формы?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## **Мастацтва жывапісу.**
## Таямнічы свет карцін

**Жывапіс** – мастацтва стварэння мастацкіх вобразаў з дапамогай фарбаў.

Асноўнымі выразнымі сродкамі жывапісу з'яўляюцца: **колер, фактура*** і **асвятленне**.

Пры стварэнні мастацкіх твораў варта ўлічваць эмацыянальныя магчымасці колеру. Колер выклікае пэўныя пачуцці.

У творы пры дапамозе колеру перадаецца настрой. Цёплыя колеры, яркія і насычаныя тоны выкарыстоўваюць для перадачы радаснага настрою. Халодныя колеры, цёмныя, прыглушаныя тоны – сумнага. Перавага цёплых ці халодных колераў у кампазіцыі вызначае яе каларыт.

З дапамогай асвятлення мастак дакладна перадае аб'ём адлюстраваных аб'ектаў. Часам ён наўмысна асвятляе толькі частку палатна, каб вылучыць галоўнае ў карціне.

У тэхніцы алейнага жывапісу творы ствараюцца з дапамогай мазкоў. Мазкі могуць быць у выглядзе кропак, ліній, плям. Часцей за ўсё мастакі спалучаюць гэтыя выяўленчыя элементы. Так лягчэй перадаць фактуру адлюстраваных аб'ектаў.

У кожнага майстра свая арыгінальная манера накладання мазкоў. Па характары мазкоў вызначаецца індывідуальны почырк мастака.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне



1





Іван Хруцкі. Плады і птушка. 1833



2





Віктар Васняцоў. Волаты. 1881–1898



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

3



Джозеф Уільям Цёрнэр.
Кітабойныя судны. 1845–1846

4



Каміль Каро. Парыў ветру. Пачатак 1870-х



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Наколькі зразумелымі бываюць творы жывапісу, настолькі яны могуць быць загадкавыя. Часам лягчэй зразумець абстрактную карціну, чым разгадаць таямніцу ўсмешкі жанчыны на партрэце.



Пабла Пікаса.
Паэт. 1912

5 



Леанарда да Вінчы.
Мона Ліза. 1503

6 

**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 1–6. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Назавіце выразныя сродкі жывапісу.

**Пытанні.** **1.** Як вы разумееце выраз «эмацыянальныя магчымасці колеру»?

**2.** Пры дапамозе якога выразнага сродку перадаецца настрой у жывапісе?

**3.** Што дапамагае мастаку перадаць аб'ём адлюстраваных аб'ектаў?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Мастацтва скульптуры.
## Дасканаласць скульптурных твораў

**Скульптура** – мастацтва стварэння аб’ёмных мастацкіх твораў.

Асноўнымі выразнымі сродкамі скульптуры з’яўляюцца: **форма, ракурс* (паварот), аб’ём**.

Скульптура – адзін з самых старажытных відаў выяўленчага мастацтва. Яшчэ першабытныя людзі стваралі розныя аб’ёмныя фігуркі з гліны. Выявы жывёл і людзей былі невялікага памеру. Калі з’явіліся прылады працы (нажы і сякеры), пачалі выразаць або высякаць выявы з дрэва. Фігуркі выкарыстоўвалі як абярэгі. Лічылася, што яны прыносяць поспех на паляванні.

Сучасны мастак-скульптар выконвае шмат папярэдніх малюнкаў. Гэта накіды і замалёўкі з натуры, а таксама эскізы* будучых работ. Ён загадзя прадумвае ўсе дэталі выявы.

Перш чым увасобіць мастацкую задуму ў рэальнасць, скульптар лепіць мадэль* невялікага памеру. Па ёй удакладняе прапорцыі, характар руху (позы і жэсты) аб’ектаў. Мастак таксама плануе, дзе будзе размяшчацца скульптура – у інтэр’еры будынка або ў прыродным асяроддзі. Ад гэтага залежыць выбар памеру рэльефу або аб’ёмнай скульптуры.

Рэльефныя скульптурныя творы выразаюць з дрэва, адліваюць з гіпсу, бетону, металу. Рэльеф добра ўспрымаецца пры бакавым асвятленні. Каб разгледзець, убачыць без скажэння ўсе дэталі,



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

трэба знаходзіцца перад творам. Фатографы ведаюць пра асаблівасці ўспрымання рэльефу. Дзякуючы ўдалым здымкам мы можам палюбавацца рэльефнай скульптурай розных краін.

1



Эфес. Турцыя. Фрыз храма Адрыяна.
1 стагоддзе н. э.

2



Сяргей Селіханаў.
Рэльеф на абеліску Перамогі. Мінск. 1954



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Аб’ёмныя скульптурныя творы высякаюць з каменю і дрэва, адліваюць з гіпсу і бронзы. У адрозненне ад рэльефнай аб’ёмную скульптуру можна разглядаць з усіх бакоў. Таму яна павінна быць выразнай у розных ракурсах.

Аб’ёмную скульптуру невялікага памеру адносяць да дробнай пластыкі* . Такія творы лепяць з гліны, выразаюць з дрэва і косці.



Ніка Самафракійская. Мармур.
Старажытная Грэцыя. Канец 4 стагоддзя да н. э.

3



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

4



Андрэй Заспіцкі, Аляксандр Фінскі.
Адам Міцкевіч. Бронза. Мінск. 2003



Васілій Ватагін.
Пінгвін з птушанём.
Дрэва. Расія. 20 стагоддзе

5



Сяргей Канёнкаў.
Дзед-палявік. Дрэва.
Расія. 20 стагоддзе

6



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 1–6. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Назавіце выразныя сродкі скульптуры.

**Пытанні.** **1.** Чым адрозніваецца аб'ёмная скульптура ад рэльефу?

**2.** Якія матэрыялы выкарыстоўваюцца для стварэння твораў скульптуры?

**3.** Якія творы адносяць да дробнай пластыкі? Якія матэрыялы выкарыстоўваюцца пры іх стварэнні?

## Жанры выяўленчага мастацтва

Творы графікі, жывапісу, скульптуры падзяляюцца на жанры.

> **Жанр** – від мастацкіх твораў з падобнымі тэмамі і аб'ектамі адлюстравання.

Асноўнымі жанрамі з'яўляюцца: нацюрморт, пейзаж, партрэт, бытавы, гістарычны, батальны, анімалістычны, міфалагічны (былінна-казачны) і іншыя.

### Нацюрморт

> **Нацюрмортны жанр** – жанр, творы якога паказваюць прадметы, размешчаныя ў рэальным побытавым асяроддзі.

У творах нацюрмортнага жанру выяўляюцца прадметы побыту, кветкі, агародніна і садавіна. Часцей за ўсё нацюрморт выконваецца з натуры.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Спачатку мастак падбірае прадметы, якія дапамогуць раскрыць тэму. Потым складае нацюрморт, прадумваючы размяшчэнне кожнага прадмета і драпіровак. І пасля гэтага прыступае да малявання.

Матэрыялы і тэхніку выканання нацюрморта трэба вызначыць загадзя. Гэта могуць быць графітны аловак, акварэль, гуаш, алей. Майстэрства мастака выяўляецца ў передачы канструкцыі прадметаў і мадэліроўцы* іх аб'ёму. Мазкі фарбы, штрыхі алоўка могуць шмат распавесці пра асобу мастака. Тэхнічна дасканалыя лініі і мазкі сведчаць пра яго шматгадовую спрактыкаванасць. Яркае колеравае вырашэнне карціны гаворыць пра асаблівае ўспрыманне навакольнага свету. Старанная прапрацоўка дэталяў адлюстроўвае рысы характару майстра.

1



Ян Давідс дэ Хем. Нацюрморт з папугаямі. 1650



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У нацюрморце мастак выяўляе сваё разуменне прыгажосці формы і канструкцыі аб’ектаў.







2

Алена Шастоўская. Нацюрморт з хрызантэмамі. 1990

**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 1, 2. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Вызначце, колькі прасторавых планаў выкарыстоўваюць мастакі ў кампазіцыях. Абгрунтуйце свой адказ.

**Пытанні.** **1.** Якія выразныя сродкі выкарысталі мастакі ў мэтах рэалістычнага (праўдзівага) адлюстравання нацюрморта?

**2.** Якія выразныя сродкі выкарысталі мастакі для перадачы аб’ёму прадметаў у кампазіцыях?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Пейзаж

**Пейзажны жанр** – жанр, творы якога адлюстроўваюць аб’екты і з’явы прыроды.

Карціны і графічныя аркушы з выявай матываў прыроды адносяць да пейзажнага жанру. Але мастак не капіруе прыродныя аб’екты з усімі дэталямі, падобна фотаапарату. Ён стварае мастацкі вобраз прыроды па законах прыгажосці.

Пры выкананні пейзажа мастак можа змяняць форму і колер аб’ектаў прыроды. Часам дадае або прыбірае, павялічвае або памяншае некаторыя элементы пейзажа. Можа мяняць аб’екты месцамі.

3



Станіслаў Жукоўскі.
Альтанка ў парку ранняй вясной. 1906



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



4

Васіль Шаранговіч. Ілюстрацыя да кнігі
Якуба Коласа «З майго летапісу». 1967

Пейзаж можа мець гістарычны, гераічны, фантазійны і лірычны характар. Часта пейзаж служыць фонам у творах іншых жанраў.

**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 3, 4. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Вызначце, колькі прасторавых планаў перададзена ў кампазіцыях.

**Пытанні.** **1.** Якія выразныя сродкі выкарыстаў мастак для рэалістычнага адлюстравання пейзажа (іл. 3)?

**2.** Якія выразныя сродкі выкарыстаў мастак для перадачы глыбіні прасторы ў пейзажы (іл. 4 )?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Партрэт

**Партрэтны жанр** – жанр, творы якога адлюстроўваюць чалавека або групу людзей.

У партрэце мастакі імкнуцца перадаць індывідуальнае аблічча канкрэтнага чалавека. Але асноўнай задачай з'яўляецца перадача ўнутранага свету і характару партрэтаванага. Партрэтыст таксама імкнецца паказаць тую эпоху, у якой жыў ці жыве чалавек.

Існуе шмат разнавіднасцяў партрэта. Па характары выявы вылучаюцца дзве асноўныя групы. Гэта парадныя і камерныя партрэты.

На парадным партрэце чалавека выяўляюць у поўны рост (на кані, стоячы ці седзячы). На камерным – выкарыстоўваецца пагруднае, паяснае, пакаленнае адлюстраванне.

Партрэт, на якім мастак паказвае самога сябе, называецца аўтапартрэтам.

Партрэт, на якім адлюстроўваюцца перажыванні чалавека, называюць псіхалагічным. У работах вялікіх майстроў паказваецца глыбіня ўнутранага свету чалавека.

Па колькасці выяўленых людзей вылучаюць адзіночныя, парныя і групавыя партрэты.

Выбар памеру партрэта, яго кампазіцыйнае вырашэнне залежаць ад творчай задумы мастака.

**Заданні.** 1. Разгледзьце ілюстрацыі 5, 6. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне





Ян Матэйка.
Аўтапартрэт. 1892

Якаб Весель. Партрэт
Іераніма Радзівіла. 1746

5

6

**2.** Назавіце віды партрэтаў па колькасці адлюстраваных персанажаў.

**Пытанні. 1.** Як называюць партрэты ў залежнасці ад таго, якая частка фігуры паказаная? Прывядзіце прыклады.

**2.** Як называецца партрэт, на якім мастак адлюстроўвае самога сябе?

**3.** Як называецца партрэт, на якім паказаны глыбіня ўнутранага свету і перажыванні чалавека?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Бытавы жанр

**Бытавы жанр** – жанр, творы якога адлюстроўваюць сцэны паўсядзённага жыцця людзей.

Бытавы жанр – адзін з самых пашыраных жанраў выяўленчага мастацтва. Ужо ў першабытным мастацтве адлюстроўваліся сцэны палявання, шэсцяў, абрадаў.

У творах бытавога жанру мастакі паказваюць сваіх сучаснікаў. Карціны розных эпох знаёмяць нас з жыццём людзей свайго часу. Гэта могуць быць сцэны з жыцця цароў і шляхты, выявы працоўнай дзейнасці земляробаў. У мастацкіх творах адбілася сацыяльная няроўнасць людзей.

7



Аляксей Венецыянаў. Гумно. 1821



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У работах пра Вялікую Айчынную вайну паказаны кароткія перадышкі паміж баямі на фронце.





Юрый Няпрынцаў. Адпачынак пасля бою. 1955

8 

**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 7, 8. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Апішыце колеравую гаму кожнай карціны.

**Пытанні.** **1.** Калі чалавек пачаў адлюстроўваць побытавыя сцэны? Якія сюжэты ён выяўляў у малюнках?

**2.** Каго і што адлюстроўваюць мастакі ў творах бытавога жанру?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Гістарычны жанр

**Гістарычны жанр** – жанр, творы якога прысвечаны гістарычным дзеячам і падзеям.

Творы гістарычнага жанру адлюстроўваюць значныя з'явы ў гісторыі чалавецтва, узнаўляюць мінулае. Сучасныя мастакі выяўляюць і нядаўнія гістарычна значныя падзеі.

Гістарычны жанр часта пераплятаецца з іншымі жанрамі. Творы з побытавымі сцэнамі адносяцца да гісторыка-бытавога жанру. Партрэты гістарычных дзеячаў – да партрэтна-гістарычнага. Гістарычны жанр асабліва цесна змыкаецца з батальным жанрам, калі ў творы раскрываецца гістарычны сэнс ваенных падзей.

9



Карл Брулоў. Апошні дзень Пампеі. 1833



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



10

Ян Матэйка. Бітва пад Грунвальдам. Фрагмент. 1878

**Заданне.** Разгледзьце ілюстрацыі 9, 10. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**Пытанні.** **1.** Каму і чаму прысвечаны творы гістарычнага жанру?

**2.** З якімі жанрамі цесна пераплятаецца гістарычны жанр?

## Батальны жанр

**Батальны жанр** – жанр, творы якога адлюстроўваюць сцэны бітваў, паходаў і іншых ваенных падзей.

У творах батальнага жанру выяўлены сцэны сухапутных, марскіх, паветраных бітваў. Мастакі-баталісты імкнуцца захаваць важныя моманты бітваў. Асноўная задача – паказаць гістарычны сэнс ваенных падзей. Гэта збліжае батальны жанр з гістарычным.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Акрамя таго, мастакі імкнуцца перадаць настрой простых салдат. Такія творы напоўнены спачуваннем да народаў, якія перажылі трагедыю вайны.



11

Аляксандр Дэйнека. Абарона Севастопаля. 1942



12

Міхаіл Басалыга.
Бітва з татарамі на Сініх Водах. 2005



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Заданне.** Разгледзьце ілюстрацыі 11, 12. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**Пытанні.** **1.** Што адлюстроўваюць творы батальнага жанру?

**2.** Якую задачу ставяць перад сабой мастакі-баталісты?

**3.** Што зближае батальны жанр з гістарычным?

**4.** Якія рысы характару воінаў паказваюць мастакі-баталісты?

## Былінна-казачны жанр

**Былінна-казачны жанр** – жанр, творы якога адлюстроўваюць герояў казак і былін.

Узнікненне былінна-казачнага жанру адносяць да другой паловы 19 стагоддзя. З'яўленне новага кірунку было звязанае з ростам цікавасці да народнай культуры.

Сюжэты для карцін мастакі чэрпалі з цудоўнага рамантычнага свету народнай фантазіі. Яны выбіралі найбольш яркія сюжэты былін, казак, старадаўніх паданняў. І на палотнах з'яўляліся гераічныя мужчынскія вобразы: волаты, ваяры, абаронцы роднай зямлі. З жаночых вобразаў асабліва папулярныя былі казачныя гераіні Васіліса Прамудрая, Царэўна Лебедзь, Алёнушка.

У выяўленчым мастацтве былінна-казачны жанр заняў адно з вядучых месцаў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне





Віктар Васняцоў.
Алёнушка. 1881

13 





Міхаіл Урубель.
Пан. 1899

14 

**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 13, 14. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Вызначце каларыт твора (іл. 13). Патлумачце, чаму мастак выбраў змяшаны каларыт.

**Пытанні.** **1.** Што, на ваш погляд, адлюстроўваецца ў творах былінна-казачнага жанру? Прывядзіце прыклады.

**2.** Якія казачныя персанажы асабліва папулярныя ў мастацкіх творах былінна-казачнага жанру?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Жанр інтэр’ера

**Жанр інтэр’ера** – жанр, творы якога адлюстроўваюць унутранае ўбранне розных памяшканняў.

Вытокі жанру інтэр’ера выходзяць з мастацтва эпохі Адраджэння. Біблейскія сцэны жывапісцы часта паказвалі ў памяшканнях. Інтэр’ер адлюстроўвалі па правілах лінейнай перспектывы*, старанна перадавалі прадметы абстаноўкі і ўбранне залаў.

Аднак у работах мастакоў інтэр’ер быў толькі месцам дзеяння персанажаў. У самастойны жанр ён вылучыўся толькі ў 17 стагоддзі. Для мастакоў стала важным перадаць аблічча ўнутранай прасторы збудаванняў. З’яўляецца вучэнне аб перспектыўным адлюстраванні інтэр’ера. Майстры пачынаюць выкарыстоўваць вуглавую і франтальную перспектыву.

***У чым заключаецца асаблівасць адлюстравання інтэр’ера ў вуглавой і франтальнай перспектыве?***

### Франтальная перспектыва

У кампазіцыі выяўляецца тры сцяны пакоя. Адна з іх размяшчаецца перад гледачом (франтальна). Гэта паказвае на тое, што выкарыстоўваецца франтальная перспектыва.

Пабудову інтэр’ера пачынаюць з вызначэння памеру і прапорцый дальняй сцяны. Меншы


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

прамавугольнік (квадрат) – больш глыбокая прастора пакоя, большы – меншая прастора. Потым праводзяць лінію гарызонту. Намячаюць на ёй пункт збегу. Праз вуглы прамавугольніка (квадрата) сцяны праводзяць лініі ў пункт збегу. Лініі, якія ідуць ад пункту збегу, паказваюць межы столі і сцен. А лініі, якія ідуць уніз, – межы падлогі і сцен.

Калі намечаны межы сцен, столі і падлогі, мастак прамалёўвае элементы інтэр’ера. На гарызантальнай плоскасці падлогі малюе мэблю. На вертыкальных паверхнях сцен – карціны, люстэркі, дываны (габелены) і іншае.

Пры пабудове інтэр’ера мастак строга трымаецца правіл лінейнай і паветранай перспектывы. Без выразнай кампазіцыйнай будовы выява інтэр’ера будзе непераканальная.





15.1 15.2

Мікалай Ціхабразаў.
Інтэр’ер у маёнтку Лапухіных. 1844



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

### Вуглавая перспектыва

У кампазіцыі выяўляюцца толькі дзве сцяны. Яны заўсёды знаходзяцца адна да адной пад вуглом. Гэта паказвае на тое, што выкарыстоўваецца вуглавая перспектыва інтэр’ера.

Галоўная прыкмета вуглавой перспектывы – два пункты збегу. Глыбіня прасторы інтэр’ера залежыць ад вышыні вертыкальнай прамой, якая адлюстроўвае мяжу дзвюх сцен.



16.1



16.2

Station Станіслаў Жукоўскі. Мінулае. Пакой старога дома. 1912

**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 15.1–16.2. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Назавіце адрозныя прыкметы франтальнай і вуглавой перспектывы.

**Пытанні.** **1.** Калі жанр інтэр’ера вылучыўся ў самастойны жанр?

**2.** Якія віды перспектывы выкарыстоўваюцца пры адлюстраванні інтэр’ера?

**3.** З чаго мастакі пачынаюць будаваць франтальную перспектыву? Вуглавую?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Анімалістычны жанр

**Анімалістычны жанр** – жанр, у якім галоўным матывам выявы з’яўляюцца жывёлы.

Адлюстраванне жывёл – самая старажытная тэма ў мастацтве. На скалах, сценах пячор першабытныя людзі малявалі бізонаў, коней, сцэны палявання. Ва ўсе часы мастакі адлюстроўвалі жывёл.

Анімалісты малююць карціны, ствараюць скульптуры жывёл, ілюструюць кнігі пра прыроду. Пастаянныя назіранні за жыццём жывёл дазваляюць мастакам больш даведацца пра іх звычкі.

Каб стварыць рэалістычны вобраз жывёлы, мастак павінен добра ведаць прапорцыі яе цела. Майстэрства анімаліста выяўляецца ва ўменні адлюстраваць жывёлу ў руху.

17



Франс Снейдэрс. Ліса і чапля. 1657



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



18





Альбрэхт Дзюрэр. Заяц. 1502

**Заданні.** Разгледзьце ілюстрацыі 17, 18. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**Пытанні.** **1.** Хто з’яўляецца асноўным аб’ектам адлюстравання ў творах анімалістычнага жанру?

**2.** Якія матэрыялы выкарыстоўваюць мастакі-анімалісты пры стварэнні вобразаў жывёл?

## **Мастацтва архітэктуры.** Прыгажосць і веліч архітэктурных збудаванняў



**Архітэктура** – мастацтва праектавання, узвядзення і ўпрыгожвання збудаванняў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Выразнымі сродкамі архітэктуры з’яўляюцца: **кампазіцыя, сіметрыя, аб’ём, рытм**.

Усе архітэктурныя пабудовы прызначаюцца для жыцця і дзейнасці людзей. Трываласць архітэктурных аб’ектаў залежыць ад выкарыстанага матэрыялу. А прыгажосць і веліч – ад формы, прапорцый і дэталяў.

1



Жылы дом у аграгарадку Баруны Ашмянскага раёна Гродзенскай вобласці

2



Палац спорту «Вікторыя» ў горадзе Брэсце



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Збудаванні новага тыпу праектуюцца і будуюцца з улікам дасягненняў пэўнай цывілізацыі. Ва ўсе часы архітэктары ўлічвалі тэхнічныя магчымасці краіны. Але шмат што залежыла і ад іх таленту. Знакамітымі сталі тыя дойліды*, якія знайшлі прынцыпова новае рашэнне будаўнічых задач. Напрыклад, архітэктар прыдумаў і пабудаваў падвесны мост. Або спраектаваў і ўзвёў унікальнае збудаванне з новых матэрыялаў.

**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 1, 2. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Вызначце, якія геаметрычныя формы складаюць канструкцыю збудаванняў.

**3.** Пералічыце выразныя сродкі архітэктуры.

**Пытанні.** **1.** Як вы разумееце слова «архітэктура»?

**2.** Як вы лічыце, чаму пры праектаванні будынкаў трэба ўлічваць іх прызначэнне? Абгрунтуйце свой адказ.

**3.** Ці мэтазгодна ў нашай кліматычнай зоне ў сельскай мясцовасці будаваць жылыя дамы з металу (каркас будынка) і шкла (сцены)? Абгрунтуйце свой адказ.

**4.** Як вы думаеце, чаму архітэктурныя аб’екты ўспрымаюцца як сімвалы пэўнага горада ці краіны? Дакажыце свой пункт гледжання.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.
## Прыгажосць і вытанчанасць прадметаў побыту

**Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва** – від мастацтва, творы якога маюць утылітарнае* і эстэтычнае прызначэнне.

Выразнымі сродкамі вырабаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва з'яўляюцца: **форма, колер, дэкор (аздабленне).** Яны ўплываюць на знешнія прыкметы прадметаў і іх эстэтычныя якасці. Часам форма прадмета побыту настолькі дасканалая, што не патрабуе дэкору. Такі выраб сапраўды адносіцца да твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Усе творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва павінны быць функцыянальнымі і прыгожымі. Прыгажосць вырабу раскрываецца ў прадметным асяроддзі, для якога ён прызначаны. Да твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва адносяцца дэкаратыўныя тканіны, дываны (габелены), мастацкае шкло, фарфор. Разьбяная мэбля, вышытае адзенне, звязаныя спіцамі або кручком сурвэткі і пакрывалы – гэта таксама мастацкія вырабы.

Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва ўзнікла ў глыбокай старажытнасці і стала асноўным відам народнай творчасці. Вырабы народных умельцаў ўпрыгожвалі сціплы сялянскі побыт. Прадметы, што захаваліся да нашага часу, сведчаць аб іх высокіх мастацкіх якасцях. Таму беражліва захоўваюцца ў сем'ях стогадовыя прабабчыны абрусы, сурвэткі, пакрывалы.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



1 Ганна Шкуратава.
Абрус. Фрагмент.
Вёска Астраўляны
Гарадоцкага раёна
Віцебскай вобласці.
1920-я



2 Дар'я Карпечанкава.
Сурвэтка. Фрагмент.
Вёска Галяшова
Руднянскага раёна
Смаленскай вобласці.
1920-я



3 Ганчарныя вырабы.
Пасёлак Івянец
Валожынскага раёна
Мінскай вобласці.
1970-я



4 Таццяна Шашолка.
Фрагмент пакрывала
(посцілкі). Вёска Дубнае
Старадарожскага раёна
Мінскай вобласці.
1920-я



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Сучасныя дэкаратыўныя вырабы ствараюцца з улікам народных традыцый. Яны вырабляюцца з гліны, скуры, дрэва, бронзы. Выклікае цікавасць роспіс па дрэве беларускіх майстроў. Пры яго выкананні выкарыстоўваюць традыцыйныя ўзоры і арнаменты.



Дзмітрый Цубер.
Дэкаратыўная талерка. 1985

5



Ніна Пачынава.
Куфэрак. 2003

6

**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 5, 6. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Пералічыце выразныя сродкі вырабаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

**Пытанні.** **1.** Ці можа прадмет побыту лічыцца творам дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, калі на ім няма дэкору?

**2.** Як вы думаеце, ці ўлічваюць сучасныя майстры народныя традыцыі? Абгрунтуйце свой адказ.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# 3. МАЙСТЭРСТВА СТВАРЭННЯ МАСТАЦКІХ ВОБРАЗАЎ

## Шматаблічны свет мастацкіх вобразаў

Вакол сучаснага чалавека свет, які стварылі яго продкі. Людзі навучыліся будаваць жыллё і шыць адзенне. Стагоддзямі людзі назапашвалі досвед па добраўпарадкаванні свайго жыцця. Аднойчы чалавек зразумеў, што недастаткова жыць у цяпле і насіць зручную вопратку. Трэба, каб усе навакольныя прадметы прыносілі радасць. Вось тады людзі ўпершыню ўпрыгожылі ўзорамі сваё адзенне і прылады працы. Магчыма, так ўвайшло ў жыццё чалавека мастацтва. Цяпер яно стала неад'емнай часткай нашага жыцця.

Праз свет мастацкіх вобразаў перадаецца творчы досвед іх стваральнікаў. Мастацтву адлюстроўваць, канструяваць і ляпіць прафесійныя мастакі вучыліся з ранніх гадоў.

Нялёгка навучыцца разумець творы мастацтва. Кожны з відаў мае свае выяўленча-выразныя сродкі. Для пачатку трэба прааналізаваць характар выяў, якія ўключаныя ў кампазіцыю. Гэта дапаможа вызначыць, чаму мастацкія вобразы створаны менавіта ў такім стылі, а таксама разгадаць творчую задуму мастака.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Віды выяў

У выяўленчым мастацтве вылучаюць некалькі відаў выяў. Гэта лінейныя, контурныя, сілуэтныя, умоўна-плоскасныя і аб’ёмныя выявы.

1


Лінейная выява

2


Контурная выява

3


Сілуэтная выява

4


Умоўна-плоскасная выява



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



5.1





5.2

Аб’ёмныя выявы

## Віды мастацкіх вобразаў

У залежнасці ад характару выявы і колеравага (тонавага) вырашэння аб’ектаў вылучаюць некалькі відаў мастацкіх вобразаў: рэалістычныя, дэкаратыўныя, фантазійныя і абстрактныя.



6.1





6.2

Рэалістычныя вобразы



Правообладатель Адукацыя і выхаванне







7.1

7.2

Дэкаратыўныя вобразы







8.1

8.2

Фантазійныя вобразы



Правообладатель Адукацыя і выхаванне







9.1 9.2

Абстрактныя вобразы

**Заданні. 1.** Разгледзьце ілюстрацыі 1.1–9.2. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Параўнайце контурную і сілуэтную выявы аб’екта. Раскажыце пра адрозненні.

**3.** Назавіце віды мастацкіх вобразаў.

**Пытанні. 1.** Якія віды выяў вы ведаеце? Пералічыце.

**2.** Ці будзе вядомы фантазійны вобраз жывёлы, калі яна прадстаўлена контурным малюнкам? Чаму вы зрабілі такую выснову?

**3.** Як вы лічыце, ці можна сілуэтную выяву аб’екта назваць сілуэтным вобразам?

**4.** Як вы лічыце, ці можна ўмоўна-плоскасную выяву прадмета назваць умоўна-плоскасным вобразам?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Школа мастацтва

### Адлюстраванне агародніны, садавіны, прадметаў побыту

### Паслядоўнасць адлюстравання бурака



1.1



1.2



1.3



1.4





**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 1.1–1.4. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Раскажыце, як размяркоўваюцца святлоценявыя градацыі на выяве бурака.

**Пытанні.** **1.** Якое асвятленне (цёплае або халоднае) выкарыстаў мастак пры мадэліроўцы аб'ёму аб'екта?

**2.** Якія фарбы трэба змяшаць, каб знайсці лакальны* колер бурака?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

### Паслядоўнасць адлюстравання морквы



2.1



2.2



2.3



2.4





**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 2.1–2.4. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Раскажыце, як размяркоўваюцца святлоценявыя градацыі на выяве морквы.

**Пытанні.** **1.** Якія геаметрычныя целы (або іх часткі) нагадвае форма морквы?

**2.** Якое асвятленне выкарыстаў мастак пры мадэліроўцы аб’ёму аб’екта?

**3.** Што такое лакальны колер прадмета?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**4.** Якія фарбы трэба змяшаць, каб знайсці лакальны колер морквы?

**5.** Як знайсці колер для асветленага і ценявога ўчасткаў морквы?

## Паслядоўнасць адлюстравання радыскі



3.1



3.2





**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 3.1, 3.2. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Раскажыце, як размяркоўваюцца святлоценявыя градацыі на аб'екце.

**Пытанні.** **1.** Якія геаметрычныя целы (або іх часткі) нагадвае форма радыскі?

**2.** Якое асвятленне выкарыстаў мастак пры мадэліроўцы аб'ёму аб'екта?

**3.** Якія фарбы трэба змяшаць, каб знайсці лакальны колер радыскі?

**4.** Як знайсці колер для асветленага і ценявога ўчасткаў радыскі?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Паслядоўнасць адлюстравання грушы жывапіснымі сродкамі



4.1



4.2



4.3



4.4





**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 4.1–4.4. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Раскажыце, як размяркоўваюцца святлоценявыя градацыі на аб’екце.

**Пытанні.** **1.** Якія геаметрычныя целы (або іх часткі) нагадвае форма грушы?

**2.** Якое асвятленне выкарыстаў мастак пры мадэліроўцы аб’ёму аб’екта?

**3.** Як знайсці колер для асветленага і ценявога ўчасткаў грушы?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Паслядоўнасць адлюстравання апрацоўчай дошкі жывапіснымі сродкамі


5.1


5.2


5.3


5.4







Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Паслядоўнасць адлюстравання апрацоўчай дошкі графічнымі сродкамі



6.1



6.2





**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 5.1–6.2. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Раскажыце, як размяркоўваюцца святлоценявыя градацыі на аб'екце.

**Пытанні.** **1.** Якія графічныя сродкі выкарыстаў мастак пры мадэліроўцы аб'ёму апрацоўчай дошкі?

**2.** Якое асвятленне выкарыстаў мастак пры мадэліроўцы аб'ёму аб'екта жывапіснымі сродкамі?

**3.** Якія фарбы трэба змяшаць, каб знайсці лакальны колер апрацоўчай дошкі?

**4.** Як вы лічыце, лінейную або святлопаветраную перспектыву выкарыстаў мастак пры адлюстраванні апрацоўчай дошкі? Абгрунтуйце свой адказ.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Паслядоўнасць адлюстравання збана графічнымі і жывапіснымі сродкамі

1.1



1.2



1.3



1.4



2.1



2.2





Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 1.1–2.2. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Раскажыце, як размяркоўваюцца святлоценявыя градацыі на аб'екце.

**Пытанні.** **1.** Якія графічныя сродкі выкарыстаў мастак пры мадэліроўцы аб'ёму збана?

**2.** Якое асвятленне выкарыстаў мастак пры мадэліроўцы аб'ёму аб'екта жывапіснымі сродкамі?

**3.** Якія фарбы трэба змяшаць, каб знайсці лакальны колер збана?

## Адлюстраванне дрэў, будынкаў, транспартных сродкаў

### Паслядоўнасць адлюстравання дуба графічнымі і жывапіснымі сродкамі



1.1



1.2



Правообладатель Адукацыя і выхаванне





1.3



1.4





2.1





2.2

**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 1.1–2.2. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Раскажыце, у якой паслядоўнасці выконвалася выява дуба жывапіснымі сродкамі.

**Пытанні.** **1.** Якія графічныя сродкі выкарыстаў мастак пры мадэліроўцы аб'ёму дуба?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**2.** Якое асвятленне выкарыстаў мастак пры мадэліроўцы аб'ёму аб'екта жывапіснымі сродкамі?

**3.** Якія фарбы трэба змяшаць, каб знайсці лакальны колер кроны дуба?

## Паслядоўнасць адлюстравання бярозы жывапіснымі сродкамі



3.1



3.2





3.3





3.4



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Паслядоўнасць адлюстравання бярозы графічнымі сродкамі

4.1



4.2



4.3



4.4



**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 3.1–4.4. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Раскажыце, у якой паслядоўнасці выконвалася выява бярозы жывапіснымі сродкамі.

**3.** Раскажыце, у якой паслядоўнасці выконвалася выява бярозы графічнымі сродкамі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Пытанні. 1.** Якія жывапісныя і графічныя сродкі выкарыстаў мастак пры мадэліроўцы аб’ёму бярозы?

**2.** Якое асвятленне выкарыстаў мастак пры мадэліроўцы аб’ёму аб’екта жывапіснымі сродкамі?

## Паслядоўнасць адлюстравання будынкаў (збудаванняў) жывапіснымі і графічнымі сродкамі



5.1



5.2



6.1



6.2



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 5.1–6.2. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Раскажыце, як улічаны законы лінейнай і святлопаветранай перспектывы пры выяўленні будынка.

**Пытанні.** **1.** У якой паслядоўнасці выконвалася выява будынка графічнымі сродкамі?

**2.** Якое асвятленне выкарыстаў мастак пры мадэліроўцы аб'ёму будынка жывапіснымі сродкамі?

### Паслядоўнасць адлюстравання аўтамашыны жывапіснымі сродкамі



7.1



7.2



7.3



7.4







Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Паслядоўнасць адлюстравання аўтамашыны графічнымі сродкамі



8.1



8.2



8.3



8.4

**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 7.1–8.4. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Раскажыце, як улічаны законы лінейнай і святлопаветранай перспектывы пры адлюстраванні аўтамашыны.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Пытанні.** **1.** У якой паслядоўнасці выконвалася выява аўтамашыны графічнымі сродкамі?

**2.** Якое асвятленне выкарыстаў мастак пры мадэліроўцы аб'ёму аўтамашыны жывапіснымі сродкамі?

## Адлюстраванне жывёл

Перш чым намаляваць жывёлу, варта паназіраць за ёй ці прааналізаваць фотаздымкі з яе выявай. Карысна азнаёміцца з творчасцю мастакоў-анімалістаў. Важна звярнуць увагу на прапорцыі, суразмернасць частак цела і фігуры жывёлы ў цэлым. Пры адлюстраванні жывёл трэба выбіраць выразныя павароты цела (ракурсы). Асабліва цікавыя малюнкі, дзе перададзены рух і пластыка цела жывёлы.

**Рэкамендацыі па адлюстраванні жывёл:**

- вызначце памер, прапорцыі і становішча фармату для работы;
- вызначце памер і месца размяшчэння выявы на фармаце;
- паспрабуйце перадаць анатамічныя асаблівасці жывёлы (трэба паказаць усе часткі цела);
- вытрымлівайце прапорцыі;
- перадайце рух жывёлы;
- перадайце асаблівасці знешняга выгляду жывёлы (поўсць, пёры);
- перадайце дробныя дэталі галавы жывёлы (вушы, вочы і інш.).



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Паслядоўнасць адлюстравання сабачкі



1.1



1.2



1.3



1.4





**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 1.1–1.4. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Раскажыце, у якой паслядоўнасці выконвалася выява сабачкі.

**3.** Абмяркуйце разам з аднакласнікамі магчымыя варыянты вырашэння адной з кампазіцый: «Я з сабачкам на прагулцы», «На выставе сабак».



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Пытанні.** **1.** Як вы думаеце, сабаку якой пароды адлюстраваў мастак?

**2.** Якія выразныя сродкі выкарыстаў мастак пры адлюстраванні сабачкі?

### Паслядоўнасць адлюстравання козачкі


2.1


2.2





**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 2.1, 2.2. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Раскажыце, у якой паслядоўнасці выконвалася выява козачкі.

**3.** Абмяркуйце разам з аднакласнікамі магчымыя варыянты вырашэння кампазіцыі «Я кармлю (паю) козачку».

**Пытанні.** **1.** Якая афарбоўка поўсці можа быць у козачак?

**2.** Якія выразныя сродкі выкарыстаў мастак пры адлюстраванні козачкі?


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Паслядоўнасць адлюстравання слана



3.1





3.2



**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 3.1, 3.2. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Раскажыце, у якой паслядоўнасці выконвалася выява слана.

**3.** Абмяркуйце разам з аднакласнікамі магчымыя варыянты вырашэння кампазіцыі «Слон і Моська».

**Пытанні.** **1.** Як вы думаеце, у чым адрозненне індыйскіх сланоў ад афрыканскіх?

**2.** Якія выразныя сродкі выкарыстаў мастак пры адлюстраванні слана?

**3.** Якое асвятленне выкарыстаў мастак пры мадэліроўцы аб'ёму жывёлы?

**4.** Якія фарбы трэба змяшаць, каб атрымаць колер для асветленай часткі выявы слана пры ўмове халоднага асвятлення?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Паслядоўнасць адлюстравання аленя

4.1 

4.2 

4.3 

4.4 

**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 4.1–4.4. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Раскажыце, у якой паслядоўнасці выконвалася выява аленя.

**3.** Абмяркуйце разам з аднакласнікамі магчымыя варыянты вырашэння кампазіцыі «Алені на Поўначы».

**Пытанні.** **1.** Якія выразныя сродкі выкарыстаў мастак пры адлюстраванні аленя?

**2.** Якое асвятленне выкарыстаў мастак пры мадэліроўцы аб’ёму жывёлы? Чаму?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Паслядоўнасць адлюстравання вярблюда


5.1


5.2




5.3




5.4

**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 5.1–5.4. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Успомніце, дзе жывуць аднагорбыя і двухгорбыя вярблюды. Абмяркуйце разам з аднакласнікамі магчымыя варыянты вырашэння кампазіцыі «Вярблюды ў пустыні».

**Пытанні.** **1.** Якія выразныя сродкі выкарыстаў мастак пры адлюстраванні вярблюда?

**2.** Якое асвятленне выкарыстаў мастак пры мадэліроўцы аб'ёму жывёлы? Чаму?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Паслядоўнасць адлюстравання зубра



6.1



6.2



6.3



6.4





**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 6.1–6.4. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Абмяркуйце разам з аднакласнікамі магчымыя варыянты вырашэння кампазіцыі «Белавежскія зубры».

**Пытанні.** **1.** У якой паслядоўнасці выконвалася выява зубра?

**2.** Якія выразныя сродкі выкарыстаў мастак пры адлюстраванні зубра?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Паслядоўнасць выканання кампазіцыі «На пашы»**


7.1


7.2



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



7.3





**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 7.1–7.3. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Падумайце, чаму фігуры размешчаны без кампазіцыйнай узаемасувязі. Абгрунтуйце свой адказ.

**Пытанні.** **1.** Якія мастацкія матэрыялы выбраны для выканання кампазіцыі?

**2.** Якія прыёмы выкарыстоўвае мастак для перадачы прасторы ў кампазіцыі?

**3.** Якое асвятленне выкарыстоўвае мастак для перадачы настрою прыроды ў пейзажы?

**4.** Якія прафесійныя веды дапамагаюць мастаку праўдзіва перадаць вобразы жывёл? Абгрунтуйце свой адказ.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Паслядоўнасць выканання кампазіцыі «Нароўні з ветрам»


8.1


8.2



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



8.3



8.4





**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 8.1–8.4. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**2.** Абмяркуйце разам з аднакласнікамі магчымыя варыянты вырашэння кампазіцыі «Навыперадкі з ветрам».

**Пытанні.** **1.** У якой паслядоўнасці выконвалася кампазіцыя?

**2.** Якія выразныя сродкі выкарыстаў мастак пры выкананні кампазіцыі?

## Адлюстраванне чалавека

### Асноўныя прапорцыі частак цела чалавека

Веданне прапорцый чалавека палягчае маляванне фігуры. Малюнкі ствараюцца ў адпаведнасці з вызначанай сістэмай тыповых памераў. Гэтую сістэму правіл называюць канонам*. У розныя часы ў розных народаў ствараліся ўласныя каноны адлюстравання чалавека.

Пабудова фігуры адбываецца ў адпаведнасці з канонам. Гэта дазваляе мастаку стварыць ідэальны вобраз чалавека.

Сучасны канон заснаваны на модулі*, які роўны вышыні галавы. Лічыцца, што гэта пастаянная велічыня, роўная 22 см.

У дарослага чалавека высокага росту (180 см і больш) галава ўкладваецца ва ўсёй фігуры 8 разоў. У чалавека сярэдняга росту (165–170 см) – 7 з паловай разоў. А ў нізкарослых людзей (ніжэй 165 см) – 6–7 разоў.

У дарослага чалавека шырыня плячэй роўная двум модулям, а шырыня таза – аднаму з паловай. У мужчын плечы шырэйшыя, чым у жанчын.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Прапорцыі фігуры дарослага чалавека



1



2

У дзяцей іншыя прапорцыі. Галава нованароджанага дзіцяці меншая за цела ў чатыры разы. Галава двухгадовага дзіцяці – меншая ў пяць разоў, а шасцігадовага – у шэсць разоў. Галава падлетка складае адну сёмую частку ўсёй фігуры.

У дзяцей да двух гадоў акружнасць галавы амаль роўная акружнасці груднохй клеткі. А памеры плячэй і клубаў амаль аднолькавыя.

У падлеткаў з прычыны хуткага росту шыі, ног, рук і тулава ўся постаць здаецца выцягнутай і тонкай.

Прапорцыі чалавечага цела бесперапынна змяняюцца.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Прапорцыі дзіцячай фігуры



3

**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 1–3. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Назавіце асаблівасці прапорцый дзіцячай фігуры.

**3.** Раскажыце пра асаблівасці прапорцый фігуры дарослага чалавека.

**Пытанні.** **1.** Як называюць сістэму правіл, якую выкарыстоўваюць пры адлюстраванні фігуры чалавека?

**2.** Чым адрозніваюцца прапорцыі фігуры дарослага мужчыны ад прапорцый фігуры падлетка?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Паслядоўнасць адлюстравання чалавека ў руху



4.1





4.2



5.1



5.2

**Заданні. 1.** Разгледзьце ілюстрацыі 4.1–5.2. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Назавіце асноўныя прапорцыі фігуры дарослага чалавека.

**3.** Раскажыце пра асаблівасці адлюстравання фігуры чалавека ў руху.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Адлюстраванне групы людзей у руху

### Паслядоўнасць выканання кампазіцыі «Хакеісты»

Уменне адлюстроўваць фігуры ў руху дапамагае мастаку праўдзіва перадаць вобраз чалавека. Асаблівая ўвага аддаецца перадачы прапорцый частак цела.



1.1



1.2



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



1.3





1.4



**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 1.1–1.4. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Раскажыце пра асаблівасці размяшчэння фігур у кампазіцыі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Пытанні.** **1.** Якія выразныя сродкі выкарыстаў мастак для вылучэння кампазіцыйнага цэнтра?

**2.** Колькі прасторавых планаў перададзена ў кампазіцыі?

**3.** Што дапамагло мастаку праўдзіва перадаць рухі спартсменаў? Абгрунтуйце свой адказ.

### Паслядоўнасць выканання кампазіцыі «Паветраныя гімнасты»



2.1



2.2



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



2.3



2.4

**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 2.1–2.4. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Раскажыце пра асаблівасці колеравага вырашэння кампазіцыі.

**Пытанні.** **1.** Як размешчаны фігуры ў кампазіцыі?

**2.** Якія выразныя сродкі выкарыстаў мастак для вылучэння кампазіцыйнага цэнтра?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Паслядоўнасць выканання кампазіцыі «У Вечнага агню»


3.1


3.2



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



3.3



3.4





**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 3.1–3.4. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**2.** Раскажыце, якія выразныя сродкі выбраў мастак для вылучэння галоўнага ў кампазіцыі (кампазіцыйнага цэнтра)?

**Пытанні.** **1.** Чаму мастак выбраў цёплы каларыт для вырашэння кампазіцыі? Абгрунтуйце свой адказ.

**2.** Колькі прасторавых планаў прадстаўлена ў кампазіцыі? Чаму выбрана франтальнае размяшчэнне людзей?

## Адлюстраванне партрэта

### Асноўныя прапорцыі твару чалавека

Каб навучыцца маляваць партрэт, трэба зразумець форму галавы. Гэта магчыма пры ўважлівым вывучэнні спрошчанай мадэлі галавы. Мастакі называюць яе «абрубоўкай». На гэтай схематычнай мадэлі ўсе дэталі галавы ўяўляюць з сябе геаметрычныя формы.



1.1



1.2



1.3



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Веданне асноўных прапорцый твару дапаможа стварыць партрэт дзіцяці, дарослага ці пажылога чалавека.

2.1


2.2


2.3


2.4




Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Асноўныя прапорцыі твару мужчыны



3.1 3.2

## Асноўныя прапорцыі твару жанчыны



4.1 4.2



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Паслядоўнасць выканання партрэта хлопчыка



5.1



5.2



5.3



5.4



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Паслядоўнасць выканання партрэта дзяўчынкі


6.1


6.2


6.3


6.4



**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 1.1–6.4. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Раскажыце пра асаблівасці прапорцый твару чалавека.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**3.** Раскажыце пра паслядоўнасць стварэння партрэта.

**Пытанні.** **1.** Як суадносяцца дэталі твару чалавека?

**2.** Як вызначаюцца прапорцыі дэталяў твару (вачэй, носа, рота)?

## Сакрэты майстэрства

### Дэкарыраванне прадметаў побыту

***Як дэкарыруюцца аб'ёмныя вырабы?***

Варыянтаў аздаблення прадметаў побыту – мноства. Аб'ёмныя формы (вазы, збаны) могуць дэкарыравацца арнаментам. На прадметах ён размяшчаецца па-рознаму. Вялікае значэнне мае велічыня дэкору. Трэба, каб яго памер адпавядаў памеру вырабу.



1



2



3



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

### *Як дэкарыруюцца плоскія вырабы?*

Для дэкарыравання плоскіх прадметаў (апрацоўчая дошка, падстаўка пад гарачае, абрус і інш.) лепш выбіраць простыя схемы кампазіцыйнага размяшчэння ўзору. Цэнтравая (іл. 4, 5, 7) і краявая (іл. 6) схемы размяшчэння дэкору лічацца ўніверсальнымі схемамі. Пры выкананні дэкору прадметаў мастакі імкнуцца прытрымлівацца закону кантрастаў: побач з буйной выявай суседнічаюць некалькі дробных элементаў арнаменту.



4



5



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



6



7

На эстэтычныя якасці прадмета ўплывае колеравае вырашэнне дэкору. Калі выраб цёмнага колеру, то ўзор на ім выконваецца ў светлых танах. Калі светлага колеру – у цёмных.

**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 1–7. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Раскажыце, якія выразныя сродкі выбраў мастак для дэкарыравання вырабаў.

**Пытанні.** **1.** Чаму на светлым фоне вырабу мастак выконвае дэкор цёмнымі фарбамі? Абгрунтуйце свой адказ.

**2.** Як дэкарыруюцца вырабы плоскай формы?

**3.** Як вы разумееце фразу: «Пры дэкарыраванні прадметаў варта ўлічваць закон кантрастаў»? У чым выяўляюцца яго асаблівасці?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Таямніца кавалачка гліны

### Лепка рэльефу

### *Лепка жывёл*

**Паслядоўнасць лепкі рэльефнай выявы «Залатая рыбка»**



1.1



1.2



1.3



1.4



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Паслядоўнасць лепкі рэльефнай выявы «Жар-птушка»



2.1



2.2



2.3



2.4



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Паслядоўнасць лепкі рэльефнай кампазіцыі «Спартсмен»



3.1



3.2



3.3



3.4

**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 1.1–3.4. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Растлумачце, чаму ў рэльефнай кампазіцыі больш аб'ёмнымі павінны быць галоўныя (асноўныя) элементы кампазіцыі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Пытанні.** **1.** Якія геаметрычныя формы можна ўзяць за аснову для лепкі рэльефу? Пацвердзіце свой адказ прыкладамі.

**2.** Чаму элементы рэльефу павінны быць рознай вышыні?

**3.** Як вы лічыце, для чаго рэльефным выявам надаецца фактура?

## Лепка аб’ёмных аб’ектаў

### *Лепка жывёл*

**Паслядоўнасць лепкі кампазіцыі «Кот»**

1.1 

1.2 

1.3 

1.4 



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

### Паслядоўнасць лепкі кампазіцыі «Зайка-выхваляка»


2.1


2.2


2.3


2.4



**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 1.1–2.4. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Раскажыце пра асаблівасці камбінаванага спосабу лепкі.

**Пытанні.** **1.** Якія геаметрычныя формы можна ўзяць за аснову для лепкі жывёл? Пацвердзіце свой адказ прыкладамі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**2.** Як вы лічыце, ці трэба ведаць асаблівасці будовы частак цела жывёл, каб вылепіць аб’ёмную скульптуру? Абгрунтуйце свой адказ.

### *Лепка чалавека*

**Паслядоўнасць лепкі кампазіцыі «Клоўн»**



3.1



3.2



3.3



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Паслядоўнасць лепкі казачнага персанажа «Маша»



4.1



4.2

**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 3.1–4.2. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Параўнайце варыянты мастацкага вырашэння фігурак клоўна і Машы, выкананых у рэалістычнай і дэкаратыўнай манеры.

**Пытанні.** **1.** Якія геаметрычныя формы можна ўзяць за аснову для лепкі аб'ёмнай скульптуры? Пацвердзіце свой адказ прыкладамі.

**2.** У чым асаблівасць камбінаванага спосабу лепкі? Абгрунтуйце свой адказ.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# 4. СВЕТ МАСТАЦКІХ ТЭХНІК

## Дзівосны свет мастацкіх тэхналогій

### Аплікацыя

#### Віды аплікацыі

Аплікацыю падзяляюць на прадметную, дэкаратыўную і сюжэтную.

Калі ўсе дэталі кампазіцыі выразаныя, іх раскладваюць на аснове (шчыльная папера, кардон, тканіна). Яна павінна быць крыху большага памеру, чым кампазіцыя. На аснове папярэдне вызначаюць межы аплікацыі. Розніца паміж фарматамі асновы і кампазіцыі патрэбна для паспарту. Тады аформленая ў раму аплікацыя будзе мець прывабны выгляд.

У аплікацыі магчымасці мастака абмежаваны канкрэтным колерам матэрыялу, які выкарыстоўваецца. Каб той ці іншы колер у кампазіцыі не быў адзінокі, яго паўтараюць на розных участках. Гэты прыём дазваляе дамагчыся каляровай гармоніі кампазіцыі.

Для выканання аплікацыі пажадана мець паперу розных колеравых адценняў. Яе нескладана падабраць з некалькіх набораў каляровай паперы. Пры неабходнасці паперу ў патрэбны колер варта афарбаваць самім. Пра спосабы афарбоўкі паперы распавядаецца ў раздзеле 5 гэтага вучэбнага дапаможніка (с. 179–181).



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## *Прадметная аплікацыя*

# Паслядоўнасць выканання прадметнай аплікацыі «Кветка»



1.1



1.2



1.3



1.4





Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Паслядоўнасць выканання прадметнай аплікацыі «Дрэва»



2.1



2.2



2.3



2.4



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Паслядоўнасць выканання прадметнай аплікацыі «Лісічка»



3.1



3.2



3.3



3.4



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Паслядоўнасць выканання прадметнай аплікацыі «Снягурка»



4.1



4.2



4.3



4.4



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Паслядоўнасць выканання прадметнай аплікацыі «Дзед Мароз»



5.1



5.2



5.3



5.4



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Паслядоўнасць выканання дэкаратыўнай аплікацыі «Кветка»


6.1


6.2


6.3


6.4



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Паслядоўнасць выканання дэкаратыўнай аплікацыі «Дрэва»



7.1



7.2



7.3



7.5





7.4



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

*Сюжэтная аплікацыя*

## Паслядоўнасць выканання аплікацыі «Родныя прасторы»



8.1



8.2



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



8.3



**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 1.1–8.3. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Раскажыце пра рацыянальныя прыёмы выразання парных і сіметрычных дэталяў аплікацыі.

**3.** Абмяркуйце з аднакласнікамі варыянты практычнага выкарыстання прадметнай, дэкаратыўнай і сюжэтнай аплікацыі ў побыце.

**Пытанні.** **1.** Чым адрозніваецца прадметная аплікацыя ад сюжэтнай?

**2.** Якія адметныя асаблівасці мае дэкаратыўная аплікацыя?

**3.** Якія колеры трэба падабраць для фону і дэталяў, каб аплікацыя была выразная?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Паслядоўнасць выканання кампазіцыі ў тэхніцы «трафарэт»



1.1



1.2



1.3



1.4



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 1.1–1.4. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Раскажыце пра асаблівасці падрыхтоўкі трафарэтаў для выканання кампазіцыі.

**3.** Абмяркуйце з аднакласнікамі магчымыя варыянты практычнага выкарыстання трафарэта ў побыце.

**Пытанні.** **1.** Якія матэрыялы, прыстасаванні і інструменты выкарыстоўваюцца пры вырабе трафарэтаў?

**2.** Якія колеры трэба падабраць для фону і дэталяў, каб кампазіцыя, выкананая ў тэхніцы трафарэта, была выразная?

## Манатыпія

### Паслядоўнасць выканання паштоўкі ў тэхніцы «манатыпія»




1.1



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



1.2



1.3

**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 1.1–1.3. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Раскажыце пра паслядоўнасць выканання кампазіцыі ў тэхніцы «манатыпія» па дадзеных ілюстрацыях.

**3.** Абмяркуйце з аднакласнікамі іншыя варыянты практычнага выкарыстання манатыпіі ў побыце.

**Пытанні.** **1.** Якія матэрыялы і прыстасаванні выкарыстоўваюцца пры выкананні манатыпіі?

**2.** Якія колеры трэба падабраць для фону і дэталяў, каб кампазіцыя, выкананая ў тэхніцы «манатыпія», была выразная?

**3.** Як вы лічыце, ці можна без выкарыстання папярэдне распрацаванага эскіза выканаць кампазіцыю ў тэхніцы «манатыпія»? Абгрунтуйце свой адказ.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Загадкавы свет кропак, ліній і плям

### Выкананне нацюрморта (графітны аловак)

Пры выкананні нацюрморта важна правільна перадаць аб’ём прадметаў. Для гэтага трэба вызначыць межы святлаценю. Пры мадэліроўцы аб’ёму прадметаў штрыхоўку накладваюць па форме. Характар штрыхоў залежыць ад формы аб’ектаў. Калі прадмет круглы, на малюнак наносяць дугападобныя штрыхі. А калі прамавугольны – штрыхі прамыя, у сетку, пад вуглом адзін да аднаго. Нанесеная па форме прадмета штрыхоўка лепш выяўляе яго аб’ём.

**Паслядоўнасць выканання нацюрморта з натуры**

1. Знайдзіце месца, з якога вы будзеце маляваць нацюрморт. Важна, каб форма і канструкцыя прадметаў нацюрморта былі добра бачныя.
2. Вызначце размяшчэнне фармату для работы.
3. Вызначце на фармаце велічыню ўсёй групы аб’ектаў. Потым знайдзіце месца кожнага з іх.
4. Прарысуйце форму прадметаў. Удакладніце іх прапорцыі і канструкцыю. Лінейны малюнак аб’ектаў выканайце лёгкімі тонкімі лініямі.
5. Азначце межы святлоценявых градацый (блік, святло, паўцень, цень, рэфлекс, падаючы цень).
6. Накладвайце штрыхі па форме прадмета. Пачынайце штрыхоўку з самых цёмных участкаў прадмета. Гэта ўласны і падаючы цені.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Другі слой штрыхоўкі наносіцца ў іншым кірунку (папярочным, вертыкальным). Трэці – зноў па форме прадмета. Наносьце штрыхоўку да таго часу, пакуль не атрымаеце патрэбны тон.

7. Удакладніце танальнае вырашэнне ўсіх прадметаў нацюрморта. Памятайце пра тое, што рэфлекс – самае светлае месца ў ценявой частцы аб’екта, а блік – самая светлая пляма ў яго асветленай зоне. Блікі на прадметах нацюрморта будуць розныя па светлаце. Гэта звязана з тым, што ў нацюрмортную пастаноўку ўваходзяць разнастайныя прадметы: матавыя, глянцавыя і бліскучыя.

8. Падкрэсліце больш насычаным тонам лініі асноў аб’ектаў, якія знаходзяцца на пярэднім плане.



1.1



1.2



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



1.3



1.4

**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 1.1–1.4. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Раскажыце пра асаблівасці выканання нацюрморта графічнымі сродкамі.

**3.** Абмяркуйце разам з аднакласнікамі характар выканання кампазіцыі «Нацюрморт з прадметаў побыту».

**Пытанні.** **1.** Што такое блік, святло, паўцень, цень, рэфлекс? Дзе на прадмеце яны размяшчаюцца?

**2.** Як мадэлюецца аб'ём прадметаў нацюрморта?

**3.** Як вы разумееце выказванне Аляксандра Салаўёва: «Барацьба за аб'ёмнасць і прасторавасць выявы павінна пачынацца з першага ж дотыку алоўка да ліста»?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Выкананне пейзажа
## (графітны аловак)

**Паслядоўнасць выканання лінейнага малюнка пейзажа**

1. Прадумайце матыў пейзажа, стан і настрой прыроды. Вызначце размяшчэнне лініі гарызонту.
2. Вызначце колькасць аб'ектаў і планаў у кампазіцыі. Выканайце алоўкавы накід кампазіцыі на 1/4 часткі фармату А4.
3. Выберыце фармат і размясціце яго ў адпаведнасці з кампазіцыйнай задумай.
4. Нанясіце тонкімі лініямі агульныя абрысы асноўных элементаў кампазіцыі.
5. Удакладніце велічыню элементаў пейзажа ў залежнасці ад іх размяшчэння ў прасторы.
6. Удакладніце форму аб'ектаў выявы.
7. Азначце на аб'ектах, размешчаных на пярэднім плане, межы святлоценявых градацый.

**Паслядоўнасць выканання кампазіцыі пейзажа ў тоне**

1. Вызначце тон усіх элементаў кампазіцыі.
2. Пачынайце выкананне пейзажа з тонавага вырашэння неба. Памятайце, што неба ў верхняй частцы кампазіцыі больш цёмнае па тоне. Бліжэй да лініі гарызонту – паступова высвятляецца.
3. Накладвайце штрыхі па форме прадметаў. Памятайце, што дэтальна прапрацоўваецца толькі пярэдні план. На дальнім плане аб'ём аб'ектаў паказваецца ўмоўна.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

4. Удакладніце танальныя адносіны ўсіх элементаў пейзажа.

5. Узмацніце тон некаторых аб'ектаў кампазіцыі на пярэднім плане.

1.1 

1.2 



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



1.3



1.4



**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 1.1–1.4. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**2.** Абмяркуйце разам з аднакласнікамі варыянты вырашэння кампазіцыі «Паварот чыгункі».

**Пытанні. 1.** Як мастак адлюстроўвае аб'екты пейзажа (зямлю, траву, дрэвы, пабудовы, транспартныя сродкі) на пярэднім, сярэднім і дальнім планах?

**2.** Колькі прасторавых планаў перададзена ў кампазіцыі?

## Прывабны свет колеру, святла і ценяў

### Выкананне нацюрморта ў тэхніках «акварэль» і «гуаш»

Пры выкананні нацюрморта жывапіснымі сродкамі важна вызначыць колер крыніцы асвятлення. Цёплая крыніца святла «падорыць» свой колер асветленай частцы прадмета. У ценявой частцы будуць пераважаць халодныя адценні. Пры халоднай крыніцы асвятлення ўсё наадварот.

Правільна азначаныя межы святлаценю дазволяць дакладна перадаць аб'ём прадмета.

**Рэкамендацыі па выкананні нацюрморта:**

1. Вызначце становішча аркуша паперы для работы.

2. Вызначце месца малюнка, азначыўшы межы нацюрморта лёгкімі лініямі.

3. Вызначце размяшчэнне кожнага аб'екта нацюрморта.

4. Вызначце прапорцыі прадметаў. Перадайце канструкцыю. Удакладніце і прарысуйце форму.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

5. Удакладніце прапорцыі аб'ектаў нацюрморта адносна адзін аднаго.

6. Знайдзіце на палітры фарбы, неабходныя для колеравага вырашэння кампазіцыі.

7. Пакрыйце кожны прадмет лакальным колерам, пакідаючы блікі незафарбаванымі.

8. Пакрыйце паўцені прадметаў больш насычаным колерам.

9. Прамалюйце ценявыя ўчасткі, удакладніце колер падаючых ценяў.

10. Падкрэсліце тонкім пэндзлем лініі асноў прадметаў, якія размешчаны на пярэднім плане.

### Паслядоўнасць выканання нацюрморта ў тэхніцы «акварэль»



1.1



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



1.2



1.3



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Заданне.** Разгледзьце ілюстрацыі 1.1–1.3. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**Пытанні.** **1.** Што такое канструкцыя прадмета?
**2.** Што такое прапорцыі прадметаў?
**3.** Што такое блік?
**4.** Што такое рэфлекс?
**5.** Якія градацыі святлаценю вы ведаеце?

Нацюрморт, аформлены ў паспарту і рамку, можа быць годным упрыгожваннем інтэр'еру кухні або школьнай сталовай.

### Паслядоўнасць выканання нацюрморта ў тэхніцы «гуаш»



2.1



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



2.2



2.3



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 2.1–2.3. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Раскажыце пра асаблівасці стварэння нацюрморта ў тэхніцы «гуаш».

**Пытанні.** **1.** Якія выразныя сродкі выбраны для вылучэння кампазіцыйнага цэнтра?

**2.** Як вы разумееце выказванне Леанарда да Вінчы: «Жывапісец, які бессэнсоўна змалёўвае, падобны да люстэрка, якое адлюстроўвае размешчаныя перад ім прадметы»?

## Выкананне пейзажа ў тэхніках «акварэль» і «гуаш»

**Паслядоўнасць выканання кампазіцыі пейзажа ў колеры**

1. Вызначце колеравае вырашэнне кампазіцыі (цёплы, халодны каларыт).

2. Нанясіце адпаведны колер на ўчасткі кампазіцыі, якія адведзены для неба, лесу, пабудоў, дрэў. Неба пакрываюць фарбай зверху ўніз. У верхняй частцы кампазіцыі неба па колеры халоднае, а па тоне цёмнае. Бліжэй да лініі гарызонту неба паступова змяняе свой колер. Яно становіцца больш цёплым па колеры і больш светлым па тоне.

3. Удакладніце танальныя адносіны і колер усіх элементаў пейзажа.

4. Дайце рабоце высахнуць. Намалюйце тонкім пэндзлем дробныя дэталі (птушак на небе, кусцікі на пярэднім плане) кампазіцыі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



1.1



1.2



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



1.3



1.4



Правообладатель Адукацыя і выхаванне


2.1


2.2



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



2.3



2.4



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 1.1–2.4. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Абмяркуйце разам з аднакласнікамі магчымыя варыянты вырашэння кампазіцый «Зімовы вечар» і «Гарадскі (сельскі) пейзаж».

**3.** Раскажыце пра магчымыя варыянты практычнага выкарыстання нацюрмортных і пейзажных кампазіцый у побыце.

**Пытанні.** **1.** Якія выразныя сродкі выкарыстоўвае мастак, каб перадаць стан прыроды?

**2.** Як змяняюцца велічыня і колер аб’ектаў выявы ў залежнасці ад таго, на якіх прасторавых планах яны знаходзяцца?

## Выкананне шматпланавых сюжэтных кампазіцый у тэхніцы «гуаш»

### *Адлюстраванне людзей і жывёл у руху і спакоі*

**Паслядоўнасць выканання кампазіцыі «На іпадроме»**

1. Прадумайце сюжэт кампазіцыі, вызначце колькасць персанажаў.

2. Выканайце алоўкавы накід кампазіцыі на 1/4 часткі фармату А4.

3. Размясціце аркуш фармату А4 у адпаведнасці з мастацкай задумай (накідам) кампазіцыі.

4. Размясціце фігуры на фармаце ў адпаведнасці з накідам. Удакладніце кампазіцыйную ўзаемасувязь асноўных элементаў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

5. Удакладніце велічыню кампазіцыйнага цэнтра і другарадных элементаў кампазіцыі. Звярніце асаблівую ўвагу на кампазіцыйную раўнавагу работы.

6. Удакладніце форму, прапорцыі і канструкцыю аб'ектаў выявы і іх пластычнае вырашэнне. Пры перадачы руху правільна пакажыце нахілы частак цела (галавы, тулава).

7. Азначце межы святлоценявых градацый усіх фігур, якія складаюць кампазіцыю.

8. Вызначце колеравае вырашэнне кампазіцыі (цёплы, змяшаны каларыт). Падбярыце на палітры лакальны колер асноўных фігур. Памятайце пра тое, што лакальны колер – гэта асноўны колер прадмета. Ён адпавядае колеру паўценявой часткі аб'екта.

9. Нанясіце лакальны колер на адпаведныя ўчасткі выяўленых фігур. Памятайце, што фон пакрываюць колерам паступова і пастаянна ўдакладняюць яго тон.

10. Падбярыце колеры для асветленых і ценявых участкаў фігур. Пры вызначэнні колеру для асветленых участкаў прадмета да лакальнага колеру дадаюць бялілы, а для ценявых – трохі чорнай фарбы.

11. Удакладніце танальныя адносіны і колер элементаў кампазіцыі.

12. Дайце рабоце высахнуць. Прамалюйце тонкім пэндзлем дробныя дэталі адзення людзей. Вылучыце больш яркім колерам аб'екты, якія знаходзяцца на пярэднім плане.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



1.1



1.2



Правообладатель Адукацыя і выхаванне




1.3



1.4



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 1.1–1.4. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Падумайце, якімі элементамі пейзажа можна дапоўніць кампазіцыю.

**3.** Абмяркуйце з аднакласнікамі варыянты практычнага выкарыстання сюжэтна-тэматычных кампазіцый у побыце.

**Пытанні.** **1.** Якое значэнне мае колеравая гама пры стварэнні мастацкага вобраза?

**2.** Як вы разумееце выказванне Леана Бацiста Альберцi: «Ніколі не бярыся за аловак ці за пэндзаль, пакуль ты як след не абдумаў, што табе трэба будзе зрабіць. Значна прасцей выпраўляць памылкі ў галаве, чым сашкрабаць іх з карціны»?

***Як аформіць работы ў паспарту?***

Каб прадставіць жывапісныя або графічныя работы на мастацкую выставу, іх трэба аформіць. Спачатку ў левым ніжнім куце кампазіцыі пакіньце свой аўтограф. Вы ж таксама мастакі! Як правіла, мастацкія работы афармляюцца ў паспарту. Для гэтага трэба ўзяць аркуш паперы, у два разы большы за саму работу. Потым прыклеіць яго так, каб зверху і з абодвух бакоў была аднолькавая адлегласць, а знізу крыху большая.

Інфармацыя пра аўтара работы, яе назву падаецца на асобным цэтліку (этыкетцы) і прыклейваецца з адваротнага боку паспарту. Афармленыя такім чынам работы могуць быць добрым падарункам родным і знаёмым.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Таямнічы свет формаў, пластыкі і аб’ёму

## Выкананне скульптурнага рэльефу

### Паслядоўнасць лепкі рэльефу «Зіма»



1.1



1.2



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



1.3



1.4



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Выкананне аб’ёмных скульптурных кампазіцый

### Паслядоўнасць лепкі сюжэтнай кампазіцыі «Клоўн з сабакам»


1.1


1.2


1.3


1.4



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Паслядоўнасць лепкі сюжэтнай кампазіцыі «Кракадзіл Гена і Чабурашка»



2.1



2.2



2.3



2.4



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Паслядоўнасць лепкі сюжэтнай кампазіцыі «Маша і мядзведзь»



3.1



3.2



3.3



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 1.1–3.3. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Раскажыце пра паслядоўнасць лепкі аб'ёмнай скульптурнай кампазіцыі.

**Пытанні.** **1.** Чым адрозніваецца рэльефная скульптурная выява прадмета ад аб'ёмнай?

**2.** Якія матэрыялы і інструменты выкарыстоўваюць скульптары?

## Чароўны свет ажурных узораў

### Выцінанка

Па кампазіцыйнай будове выцінанкі падзяляюць на сіметрычныя, рапортныя і разеткавыя.

### *Сіметрычная выцінанка*

**Паслядоўнасць выканання пано «Дрэва жыцця»**



1.1



1.2



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



1.3



1.4

**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 1.1–1.4. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Абмяркуйце з аднакласнікамі варыянты рацыянальнага выразання дадатковых каляровых элементаў для гатовай выцінанкі (іл. 1.2).

**3.** Распрацуйце малюнак для выканання сіметрычнай выцінанкі.

**Пытанні.** **1.** Якія матэрыялы, прыстасаванні і інструменты выкарыстоўваюцца пры выкананні выцінанкі?

**2.** Як складваецца аркуш паперы для выканання сіметрычнай выцінанкі?

**3.** Які колер аркуша паперы пажадана выбраць для выцінанкі светлага тону?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## *Разеткавая выцінанка*

### Паслядоўнасць выканання кампазіцыі «Танец сняжынак»



1.1



1.2



1.3



1.4



1.5



1.6



1.7



1.8 

**Заданні. 1.** Разгледзьце ілюстрацыі 1.1–1.8. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Раскажыце пра асаблівасці выканання разеткавай выцінанкі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Пытанні.** **1.** Як складваецца аркуш паперы для выканання разеткавай выцінанкі?

**2.** Як вы лічыце, што дапамагло мастаку перадаць у кампазіцыі ўражанне руху сняжынак?

## *Рапортная выцінанка*

### Паслядоўнасць выканання фрызу



3.1



3.2



3.3



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



3.4

**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 3.1–3.4. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Распрацуйце эскіз фрызу для афармлення краю сіметрычнай выцінанкі.

**3.** Абмяркуйце з аднакласнікамі варыянты практычнага выкарыстання выцінанкі ў побыце.

**Пытанні.** **1.** Як складваецца аркуш паперы для выканання рапортнай выцінанкі?

**2.** Якую ролю адыгрывае колер ва ўспрыманні ажурных узораў?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Захапляльны свет цацак-самаробак і сувеніраў

### Выкананне вырабаў у тэхніцы «папяровая пластыка»

Папера – адзін з самых даступных і цікавых сучасных вырабных матэрыялаў. Яе дэкаратыўныя якасці даўно ацанілі народныя майстры ў многіх краінах. Папера як матэрыял для разнастайных вырабаў ні з чым не параўнальная. Асноўнае, чым яна прыцягвае, – гэта лёгкасць апрацоўкі. Для працы з паперай патрэбны толькі нажніцы, спецыяльны нож (разак) і клей.

Папера лёгка паддаецца трансфармацыі. Плоскі аркуш можа ператварыцца ў аб’ёмную канструкцыю. Папера доўга захоўвае форму, якую ёй надалі. Таму мастакі выкарыстоўваюць яе для стварэння рэльефных і аб’ёмных вырабаў.

### Выкананне рэльефных кампазіцый

#### Паслядоўнасць выканання паштоўкі і пано «Букет»



1.1



1.2



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



1.3



1.4



2



3



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Паслядоўнасць выканання рэльефнай кампазіцыі «Зімовы пейзаж»



4.1



4.2



4.3



5



Правообладатель Адукацыя і выхаванне


6


7



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 1.1–7. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Абмяркуйце з аднакласнікамі магчымыя варыянты выканання рэльефных кампазіцый «Кветкі ў вазе», «Зімовы пейзаж».

**Пытанні.** **1.** Якія прыёмы трансфармацыі паперы выкарыстоўваліся пры выкананні рэльефных кампазіцый?

**2.** Якую ролю адыгрывае ў рэльефнай кампазіцыі колер?

## Выкананне падвесных канструкцый

### Паслядоўнасць выканання падвесных канструкцый на плоскай аснове





1



2



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Паслядоўнасць выканання падвесных канструкцый на аб'ёмнай аснове



3.1



3.2



3.3



3.4



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



4.1



4.2



4.3



4.4



4.5



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Заданні.** 1. Разгледзьце ілюстрацыі 1–4.5. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

2. Абмяркуйце разам з аднакласнікамі варыянты вырабу падвесных канструкцый на плоскіх трохвугольных і авальных каркасах па тэмах: «Свята кветак», «Навагодняя кампазіцыя».

**Пытанні.** 1. Якія прыёмы трансфармацыі паперы выкарыстоўваліся пры выкананні падвесных канструкцый?

2. Як падрыхтаваць аснову для падвеснай канструкцыі?

## Выкананне аб'ёмных цацак

Для вырабу аб'ёмных цацак выкарыстоўваецца шчыльная папера. Цацкі канструююць на аснове разгортак геаметрычных цел. Краі разгортак стыкуюцца і злучаюцца з дапамогай клею. Стыкі прыкрываюць іншымі дэталямі або дробнымі дэкаратыўнымі элементамі.

Выразнасць вобраза дасягаецца за кошт дакладна выбраных суадносін памераў асновы і дэталяў. Важнае значэнне мае колеравае вырашэнне цацкі.

Перад злучэннем у адзіную канструкцыю дэталі цацкі трансфармуюцца. Яны могуць змінацца, скручвацца спіраллю, згінацца, адгінацца, складвацца гармонікам або веерам. У сабраным выглядзе ўсе дэталі цацкі і яе дэкор павінны ўяўляць з сябе адзінае цэлае.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Аб’ёмная цацка «Кот Васіль»

Калі аб’ёмная цацка вырабляецца на аснове разгорткі геаметрычнага цела, то галоўную ролю адводзяць дэталям. Яны надаюць вобразу асаблівую прывабнасць.

Пазнаёмцеся з пералікам дэталяў аб’ёмнай цацкі «Кот Васіль». Звярніце ўвагу на форму ўсіх загатовак. Вызначце, якія прыёмы трансфармацыі паперы мэтазгодна выкарыстоўваць.

**Дэталі выкраек**

1. Тулава з галоўкай.
2. Хвосцік.
3. Пярэдняя лапка (2 дэталі).
4. Задняя лапка (2 дэталі).
5. Лобік.
6. Вока (2 дэталі).
7. Вейкі (2 дэталі).
8. Шчочкі.
9. Язычок.
10. Ніжняя частка пыскі.
11. Вуха (гэтая дэталь можа адсутнічаць).
12. Банцік.
13. Сярэдняя частка банціка.
14. Аколышак кепкі.
15. Верхняя частка (дэталь) кепкі (2 дэталі).
16. Казырок.
17. Чубчык.
18. Носік.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Чарцяжы выкраек аб'ёмнай цацкі «Кот Васіль»

Прааналізуйце прадстаўленыя чарцяжы, суаднясіце дэталі выкрайкі са знешнім выглядам аб'ёмнага вырабу.






Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Паслядоўнасць выканання аб’ёмнай цацкі «Кот Васіль»

1. Вызначце колер кожнай дэталі аб’ёмнай цацкі.

2. Перанясіце на каляровую паперу выкрайкі ўсіх дэталяў цацкі. Выражыце іх (іл. 2.1). Звярніце ўвагу, што дэталь галоўкі ў гэтым вырабе не прадугледжана. Тулава і галоўка падаюцца адной загатоўкай.

3. Надайце аснове для тулава форму цыліндра і замацуйце краі клеем.

4. Выражыце з белай паперы вочкі.

5. Расфарбуйце вочкі так, як паказана на ілюстрацыі 1. Павекі па колеры зрабіце крыху святлейшымі ці цямнейшымі за колер тулава.

6. Вазьміце круглы аловак, пакладзіце на яго дэталь вока і моцна прыцісніце. Гэты прыём дазваляе атрымаць выгнутую паверхню загатоўкі. **Запомніце: плоскія дэталі не наклейваюцца на выгнутыя паверхні.** Ім трэба надаць форму, падобную на форму асновы.

7. Падрыхтуйце для наклейвання на аснову іншыя дэталі цацкі (носік, шчочкі, павекі і інш.). Наклейце іх (іл. 2.2).

8. Зрабіце выгібы на абодвух баках банціка. Сярэдзіну загатоўкі абгарніце палоскай паперы. Прыклейце банцік на тулава коціка. Пажадана, каб банцік і кепка былі аднолькавыя па колеры (іл. 2.3).

9. Надайце загатоўцы для аколышка кепкі цыліндрычную форму. Злучыце яе краі клеем.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Нанясіце клей на краі дэталі верхняй часткі кепкі. Прыклейце іх да аколышка з унутранага боку крыж-накрыж.

10. Надайце чубчыку аб’ём. Прыклейце яго з унутранага боку аколышка кепкі (іл. 2.4).

11. Надзеньце на верхнюю частку галоўкі коціка кепку набок. Цацка-самаробак гатовая!



2.1



2.2



2.3



2.4



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Аб’ёмная цацка «Барбос»

Выкарыстанне прыёмаў трансфармацыі паперы (скручванне, складванне, згінанне, гафрыраванне і інш.) дае невычэрпныя магчымасці пры канструяванні аб’ёмных вырабаў.

Пазнаёмцеся з пералікам дэталяў аб’ёмнай цацкі «Барбос» («Сабака Шарык»). Звярніце ўвагу на форму ўсіх загатовак. Вызначце, якія прыёмы трансфармацыі паперы можна выкарыстоўваць пры вырабе цацкі.

**Дэталі выкраек**

1. Тулава.
2. Пярэдняя і задняя часткі галавы (2 дэталі).
3. Бакавая частка галавы.
4. Рукаў (2 дэталі).
5. Рукавіцы для пярэдніх лапак (2 дэталі).
6. Вуха (2 дэталі).
7. Шчочкі.
8. Ніжняя частка пыскі.
9. Язычок.
10. Вока (2 дэталі).
11. Павека з вейкамі (2 дэталі).
12. Валасы.
13. Чубчык.
14. Тронак для мятлы.
15. Мятла.
16. Фартух.
17. Аколышак шапкі.
18. Верхняя частка шапкі (2 дэталі).
19. Казырок.
20. Задняя лапка (2 дэталі – могуць адсутнічаць).



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Прааналізуйце прадстаўленыя чарцяжы, суаднясіце дэталі выкрайкі са знешнім выглядам аб’ёмнага вырабу.

**Чарцяжы выкраек аб’ёмнай цацкі «Барбос»**






Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Паслядоўнасць выканання аб’ёмнай цацкі «Барбос»

1. Вызначце колер кожнай дэталі аб’ёмнай цацкі.

2. Перанясіце на каляровую паперу выкрайкі ўсіх дэталяў цацкі. Выражыце іх.

3. Вызначце дэталі, якія трэба перад наклейваннем на аснову трансфармаваць. Выканайце адпаведныя аперацыі (іл. 4.1–4.3).

4. Скруціце ў выглядзе конуса аснову для тулава і замацуйце краі клеем.

5. Зрабіце выгіб на дэталі фартуха і наклейце яго на тулава. Замацуйце на фартуху кішэню, латку, гузікі (іл. 4.4).

6. Зрабіце выгібы на кожным з рукавоў. Потым скруціце іх у выглядзе конусаў. Нанясіце клей і прыклейце рукавы да тулава. Знутры конусаў-рукавоў прыклейце лапкі (іл. 4.5).

7. Выражыце акружнасць па паказанай лініі на дэталі бакавой часткі галавы. Надайце гэтай дэталі цыліндрычную форму. Трохвугольныя выступы паперы адагніце ў сярэдзіну і наклейце на яе з аднаго боку дэталь задняй часткі галавы (патыліцы), а з другога – аснову для пыскі (іл. 4.2).

8. Наклейце на аснову для пыскі шчочкі, нос, вочкі (вочкі папярэдне расфарбуйце) (іл. 4.3).

9. Прыклейце на бакавую дэталь галавы вушы.

10. Прыклейце на галаву валасы.

11. Замацуйце кропелькай клею канцы аколышка. Да яго падклейце верхнюю частку кепкі і казырок. Надзеньце кепку на галаву Барбосу.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

12. Скруціце ў выглядзе спіралі загатоўку для тронка мятлы. (Можна шчыльна скруціць яе ў трубачку.)

13. Надрэжце загатоўку мятлы па пазначаных лініях. На кожным надрэзе зрабіце згібы. Кропелькай клею замацуйце тронак насупраць першага надрэзу. Потым скруціце загатоўку ў выглядзе трубачкі.

14. Прыклейце мятлу да пярэдніх лапак сабакі. Цацка-самаробак гатовая (іл. 4.6–4.8)!



4.1



4.2



4.3



4.4



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



4.5



4.6



4.7



4.8





Правообладатель Адукацыя і выхаванне

На мастацкую выставу аб’ёмныя цацкі прадстаўляюцца з цэтлікамі (этыкеткамі). На іх пазначаюць прозвішча і імя аўтара, узрост (колькі поўных гадоў), назву работы.

Аб’ёмныя цацкі могуць быць добрым падарункам родным і знаёмым. Імі можна ўпрыгожыць навагоднюю ёлку, інтэр’ер пакоя або актавай залы.

**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 1–4.8. Прааналізуйце іх паводле ўмоўных абазначэнняў.

**2.** Вызначце, якія прыёмы трансфармацыі паперы выкарыстоўваліся пры вырабе цацкі.

**3.** Раскажыце пра магчымыя варыянты практычнага выкарыстання аб’ёмных цацак з паперы ў побыце.

**Пытанні.** **1.** Якія геаметрычныя целы выкарыстоўваліся ў якасці асновы пры стварэнні аб’ёмных формаў?

**2.** Якія дэталі аб’ёмнай цацкі выкананы на аснове геаметрычных фігур (цел)?

**3.** Якія элементы дэкору выбраны для надання вобразу мастацкай выразнасці?

**4.** Ці мэтазгодна выразаць дробныя дэталі з цэлага аркуша паперы, калі дастаткова рэштак адпаведнага памеру?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# 5. АСНОВЫ КОЛЕРАЗНАЎСТВА

## Колеравы круг

Некалькі стагоддзяў таму пры вызначэнні палітры колераў для сваіх карцін мастакі кіраваліся інтуіцыяй. Аднак з часам быў сфарміраваны колеравы круг. У яго былі закладзены ўсе назапашаныя на працягу стагоддзяў веды пра гарманічнае спалучэнне колераў.

> **Колеравы круг** – гэта размяшчэнне асноўных, састаўных колераў і іх адценняў у пэўным парадку.

Разнастайнасць колераў утвараецца на аснове трох колераў: чырвонага, жоўтага, сіняга. Іх называюць асноўнымі (іл. 1). Калі змяшаць па чарзе адзін асноўны колер з другім, атрымаем састаўныя колеры: зялёны, аранжавы, фіялетавы (іл. 2).


1


2



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Асноўныя і састаўныя колеры таксама змешваюцца паміж сабой. Калі жоўты змяшаць з аранжавым, атрымаем жоўта-аранжавы колер. Спалучэнне жоўтага і зялёнага дасць жоўта-зялёны колер. Так атрымаем 12-частковы колеравы круг (іл. 3). Ён лёг у аснову вучэння аб гармоніі колераў. Навука пра колеры называецца «колеразнаўства».




3

У 12-частковым крузе ўсе колеры вельмі яркія і насычаныя. Каб знізіць іх насычанасць, мастакі выкарыстоўваюць чорны і белы колеры. У выніку атрымліваецца мноства тонаў і адценняў 12 колераў (іл. 4).



Правообладатель Адукацыя і выхаванне




4

**Заданні.** **1.** Разгледзьце, як размешчаны колеры ў колеравым крузе.

**2.** Вызначце, на якой палове колеравага круга размешчаны цёплыя колеры, а на якой – халодныя.

**Пытанні.** **1.** Якую агульную назву маюць тры колеры, паказаныя на ілюстрацыі 1 і размешчаныя ў сярэдзіне колеравага круга на ілюстрацыі 3?

**2.** Як вы лічыце, на што паказваюць колеры, якія размяшчаюцца вакол асноўных (іл. 2, 3)?

**3.** Як атрымаць чырвона-аранжавы (чырвона-фіялетавы) колер?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**4.** Як атрымаць чырвона-фіялетавы (сіне-фіялетавы) колер?

**5.** Як атрымаць жоўта-зялёны (сіне-зялёны) колер?

**6.** Якія колеры не прадстаўлены ў колеравым крузе, але неабходны для стварэння мастацкіх твораў у тэхніцы «гуаш»?

## Гарманічныя спалучэнні колераў

Колер – адзін з галоўных выразных сродкаў у жывапісе і дэкаратыўна-прыкладным мастацтве. Перш чым пачаць працу над жывапіснай кампазіцыяй або вырабам, мастак прадумвае спалучэнне колераў і іх адценняў. Дапамагае яму ў гэтым колеравы круг і веданне законаў колеравай гармоніі.

Пры выкананні кампазіцый у розных мастацкіх тэхніках трэба выбіраць колеры, якія гарманіруюць адзін з адным. Ад таго, наколькі правільна яны падабраны, залежаць эстэтычныя якасці работ.

Варта памятаць пра тое, што на зрокавае ўспрыманне аднаго колеру ўплывае колер, размешчаны побач. Калі цёмны і светлы колеры знаходзяцца побач, то цёмны будзе здавацца цямнейшым, а светлы – святлейшым.

Пры выкананні творчых работ мастак загадзя вызначае палітру колераў. Прадумвае колеравыя спалучэнні, каб яны выглядалі гарманічна. Удалых колеравых спалучэнняў можа быць шмат. На ілюстрацыях 1–5 мы бачым светлыя (бляклыя), шараватыя, насычаныя, яркія, цёмныя колеравыя



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

спалучэнні. Колеравыя спалучэнні вызначаюць каларыт і гаму твора.




**Заданні.** **1.** Разгледзьце прыклады гарманічных колеравых спалучэнняў (іл. 1—5). Падумайце, дзе можна выкарыстоўваць такія варыянты колеравых спалучэнняў.

**2.** Дакажыце, што для выканання творчай кампазіцыі «Кветкі і матылькі» не падыдуць колеры, прапанаваныя на ілюстрацыі 1.

**Пытанні.** **1.** На якой ілюстрацыі паказаны светлыя колеравыя спалучэнні?

**2.** На якой ілюстрацыі паказаны яркія колеравыя спалучэнні?

**3.** Якія колеры з прапанаванага шэрагу (іл. 4) вы выбераце для выканання творчай аплікацыі «Пунсовая кветачка»? Назавіце іх.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**4.** Які шэраг колеравых спалучэнняў вы выбераце для выканання творчай кампазіцыі «Ранак туманны» або «Світанак»?

**5.** Для чаго, на ваш погляд, трэба ведаць гарманічныя спалучэнні колераў?

## Спосабы афарбоўкі паперы

У якасці фарбавальнікаў для паперы можна выкарыстоўваць туш, акварэльныя і гуашавыя фарбы, заварку чаю, каву. Каб афарбаваная гуашшу папера не пэцкала фон, у раствор дадаюць трохі клею ПВА.

Пры афарбоўцы паперы выкарыстоўваюць мяккія (акварэльныя) і жорсткія (шчаціньныя) пэндзлі, а таксама тампоны з ваты, тканіны, паперы, паралону.

### Афарбоўка паперы фарбай

Падрыхтуйце паперу патрэбнага памеру. Пакладзіце пад яе некалькі газет, каб не выпацкаць стол. У невялікі посуд наліце вады, капніце ў яе дзветры кроплі фарбы. Размяшайце раствор палачкай.

Змачыце пэндзаль у растворы фарбы. Правядзіце па паперы пэндзлем або ватным тампонам некалькі палос. Нанясіце іх шчыльна адна да адной. Калі папера будзе цалкам пакрытая палосамі, трэба разраўняць нанесены слой фарбы. Калі фарбу накладвалі ў гарызантальным напрамку, то разраўноўваюць – у вертыкальным. У выніку фарба размяркуецца роўным слоем (іл. 1).



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У гэты самы раствор дадайце яшчэ крыху фарбы. Афарбуйце другі аркуш. Так можна атрымаць некалькі адценняў аднаго колеру. Калі папера пры высыханні карабаціцца, на яе трэба пакласці цяжар.

**Афарбоўка паперы заваркай чаю (кавай)**

Ад канцэнтрацыі заваркі чаю (кавы) залежыць колер афарбаванай паперы. Можна атрымаць розныя адценні прыемнага залаціста-вохрыстага колеру. Растворы наносяць пэндзлем або ватным тампонам, як і пры афарбоўцы паперы фарбай (тушшу).

На нявысахлую афарбаваную паперу можна насыпаць (нераўнамерна) парашок распушчальнай кавы (іл. 2) або буйную соль (іл. 3). Атрымліваюцца цікавыя колеравыя эфекты.

**Афарбоўка папяровым тампонам**

Дэкаратыўную паперу можна атрымаць, калі пакінуць на ёй сляды папяровага тампона. Шчыльную паперу змінаюць. Потым са змятага камяка фармуюць тампон. Тампон злёгку абмакваюць у фарбу і лёгка наносяць адбіткі на паверхню, якую афарбоўваюць. Аркуш паперы можна афарбаваць адным або рознымі колерамі (іл. 4, 5). Плямістая папера прыдатная не толькі для вырабаў. Яе можна выкарыстоўваць у якасці ўпакоўкі для падарункаў.

Цікавыя колеравыя эфекты атрымліваюцца, калі перад афарбоўкай нанесці на паперу малюнак васковай крэйдай (іл. 6).

Жорсткі пэндзаль на паперы пакідае след, падобны на тэкстуру дрэва, або надае аркушу цікавую фактуру (іл. 7, 8).


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Афарбоўка паперы спосабам «напырск»**

Над паверхняй, якую афарбоўваюць, трымаюць грэбень. Па грэбені праводзяць зубной шчоткай з фарбай. На паперу падаюць кропелькі фарбы (іл. 9).



1. Афарбоўка паперы фарбай



2. Афарбоўка распушчальнай кавай



3. Афарбоўка з выкарыстаннем солі



4. Афарбоўка аркуша папяровым тампонам адным колерам



5. Афарбоўка аркуша папяровым тампонам некалькімі колерамі



6. Афарбоўка з выкарыстаннем васковай крэйды



7. Папера, афарбаваная пад тэкстуру дрэва



8. Фактура, нанесеная жорсткім пэндзлем



9. Афарбоўка паперы спосабам «напырск»



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Заданні.** **1.** Разгледзьце ілюстрацыі 1—9.

**2.** Раскажыце, як пры афарбоўцы паперы размеркаваць фарбу раўнамерным слоем.

**3.** Прыдумайце іншыя спосабы афарбоўкі паперы. Абмяркуйце іх з аднакласнікамі. Раскажыце пра магчымае практычнае выкарыстанне гэтых спосабаў у творчай дзейнасці.

**Пытанні.** **1.** Як атрымаць дэкаратыўную паперу з плямістымі эфектамі?

**2.** Як атрымаць паперу з эфектам тэкстуры дрэва?

## Дарагія сябры!

Вось і завяршыўся чацвёрты год заняткаў па выяўленчым мастацтве. Вы асвоілі законы кампазіцыйнага будавання мастацкіх твораў. Пашырылі свае ўяўленні пра іх колеравае вырашэнне. Вы ўжо лёгка перадаеце прасторавыя планы ў пейзажы і нацюрморце. А творчыя кампазіцыі можаце выконваць у розных мастацкіх тэхніках. Спадзяёмся, што гэты вучэбны дапаможнік дапамог вам адчуць сябе творцамі, для якіх няма выяўленчых перашкод. Памятайце, што пры стварэнні мастацкіх работ вельмі важна быць арыгінальным.

Жадаем вам творчых поспехаў у цікавай для вас працы. Спадзяёмся, што яна будзе звязаная з МАСТАЦТВАМ.

*Аўтары*



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# СЛОЎНІК МАСТАЦКІХ ТЭРМІНАЎ І ПАНЯЦЦЯЎ

**Акварэ́ль** – празрыстыя фарбы на воднай аснове. Іх наносяць на паперу тонкімі слаямі, каб папера прасвечвалася праз іх. Акварэль не рэкамендуецца наносіць на паперу густымі слаямі.

**Аранжыро́ўка кве́так** – мастацтва складання кампазіцый з жывых кветак з дадаваннем сухіх раслінных матэрыялаў па пэўных правілах.

**Архітэкту́ра** – мастацтва праектавання, узвядзення і ўпрыгожвання збудаванняў. Стварэнне мастацка выразных ансамбляў.

**Афо́рт** – гравюра на медзі або цынку, а таксама адбітак з такой гравюры.

**Блік** – адлюстраванае святло, самая светлая пляма (кропка) у асветленай частцы прадмета.

**Во́браз** – форма мастацкага адлюстравання свету (рэалістычнага, уяўнага). У выяўленчым мастацтве вобраз з’яўляецца адлюстраваннем светаадчування мастака.

**Гравёр** – майстар, які займаецца гравіраваннем.

**Гравю́ра** – від графікі, які дазваляе ствараць друкаваныя адбіткі мастацкіх твораў. Аснову для гравюры выконваюць на дрэве, метале, лінолеуме, кардоне. Пры стварэнні гравюр выкарыстоўваюцца такія выразныя сродкі, як контурная лінія, штрых, пляма, тон, колер.

**Гра́фіка** – від выяўленчага мастацтва, у якім у якасці асноўных выяўленчых сродкаў ужываюцца



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

лініі, штрыхі, плямы і кропкі. Колер таксама можа выкарыстоўвацца, але ён адыгрывае дапаможную ролю. У каляровых графічных работах, акрамя чорнага, дадаткова выкарыстоўваюць адзін-два колеры.

**Гуа́ш** – густыя покрыўныя фарбы. Гуаш, як і акварэль, разводзяць вадой. Аднак гуаш дае больш яркі і насычаны колер. На паперу (кардон) яе наносяць густымі слаямі (мазкамі).

**До́йлід** – будаўнік, архітэктар.

**Дро́бная пла́стыка** – скульптура малых формаў. Гэта дэкаратыўныя вырабы з абпаленай гліны, разьба па дрэве, косці, каменю.

**Дыза́йн** – творчая дзейнасць, мэтай якой з'яўляецца праектаванне прыгожых і зручных у выкарыстанні вырабаў.

**Жанр** – від твораў мастацтва з падобным сюжэтам. У выяўленчым мастацтве вылучаюць некалькі жанраў: нацюрморт, партрэт, пейзаж, анімалістычны, гістарычны, бытавы, батальны і іншыя.

**Замалёўка** – хуткі малюнак з натуры. Ён выконваецца з мэтай збору матэрыялу для больш значнай работы. Замалёўка можа быць выкананая дэтальна.

**Калары́т** – суадносіны колераў, гармонія колеравых спалучэнняў. Каларыт бывае халодным, цёплым і змяшаным.

**Кампазіцы́йны цэнтр** – частка твора, якая найбольш поўна выяўляе галоўнае ў змесце сюжэта.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Кампазі́цыя** – структура твора, абумоўленая яго зместам і характарам.

**Кано́н** – сістэма тыповых памераў цела чалавека, прынятая за ўзор.

**Кантра́ст** – мастацкі прыём, які ўяўляе з сябе супастаўленне якіх-небудзь процілеглых вобразаў або якасцей: добры – злы, цёплы – халодны, светлы – цёмны.

**Карці́на** – твор жывапісу, які мае завершаны характар (у адрозненне ад эскіза і эцюда) і самастойнае мастацкае значэнне.

**Колеразна́ўства** – навука, якая вывучае прыроду колеру і спосабы яго ўжывання на практыцы ў розных сферах дзейнасці чалавека.

**Ко́нтур** – лінія, якая акрэслівае форму прадмета.

**Лака́льны ко́лер** – колер прадмета (аб’екта).

**Лінагравю́ра** – гравюра, выкананая на лінолеуме; адбітак такой гравюры.

**Ліне́йная перспекты́ва** – від перспектывы, пры якой памеры прадметаў паступова памяншаюцца да лініі гарызонту.

**Мадэліро́ўка аб’ёму** – стварэнне аб’ёму прадметаў у творы мастацтва пры дапамозе святлоценявых градацый. Класічны прыём перадачы на плоскасці аб’ёму прадмета.

**Мадэ́ль** – узор вырабу. Мадэль можа выконвацца ў натуральную велічыню або ў паменшаным памеры.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Мазо́к** – след ад пэндзля, пакінуты на кардоне, паперы, палатне. Тэхніка жывапісу мазкамі залежыць ад індывідуальнага майстэрства мастака.

**Манаты́піія** – від друкаванай графікі. На гладкую паверхню друкарскай формы наносіцца ад рукі малюнак фарбамі. Потым на форму кладзецца чысты аркуш паперы і прыціскаецца да яе.

**Маста́цкія (выразныя) сро́дкі** – выяўленчыя элементы і мастацкія прыёмы, якія выкарыстоўвае мастак для выяўлення зместу твора. Да іх адносяцца: кампазіцыя, перспектыва, прапорцыі, святлацень, колер, штрых, фактура і іншыя.

**Мастацтвазна́вец** – спецыяліст па мастацтвазнаўстве.

**Мастацтвазна́ўства** – навука, якая вывучае розныя віды мастацтва (звычайна выяўленчага).

**Ма́трыца** – узор, мадэль, шаблон.

**Маты́ў** – аб’ект або выяўленчы элемент, абраны мастаком для стварэння кампазіцыі. Пры стварэнні пейзажнага малюнка матывам можа з’яўляцца дрэва, будынак і іншае. У дэкаратыўна-прыкладным мастацтве матыў – гэта асобны элемент арнаменту.

**Мо́дуль** – зыходная мера, прынятая для вызначэння суадносін памераў цэлага і яго частак.

**Накі́д** – малюнак, выкананы абагульнена, без дэтальнай прапрацоўкі. У накідзе майстар увасабляе асноўную ідэю твора або вызначае характар мастацкага вобраза.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Паве́траная перспекты́ва** – бачнае змяненне колеру, абрысаў і ступені асветленасці прадметаў. Колер аб’ектаў (напрыклад, дрэвы з зялёнай кронай уздоўж дарогі) з павелічэннем адлегласці ўспрымаецца па-рознаму. Колер змяняецца ў халодны бок, а тон аб’ектаў прыглушаецца пры іх аддаленні ўглыб прасторы.

**Паўце́нь** – градацыя святлаценю, размешчаная паміж святлом і ўласным ценем.

**Перспекты́ва** – спосаб выяўлення аб’ектаў на плоскасці ў адпаведнасці з законамі зрокавага ўспрымання прадметаў чалавекам. (Гл. таксама *Паветраная перспектыва, Лінейная перспектыва*.)

**Прапо́рцыя** – адносіны памераў частак адна да адной і да цэлага.

**Ра́курс** – перспектыўнае скарачэнне адлюстраваных прадметаў. Ракурс выкарыстоўваюць для найбольш эфектнай перадачы руху і прасторы.

**Ро́спіс** – дэкаратыўная выява, якая наносіцца на прадметы побыту, сцены, столі будынкаў. Роспіс бывае арнаментальны, пейзажны, сюжэтны.

**Рытм** – чаргаванне ліній, фігур, аб’ёмаў, колеравых плям у творы мастацтва.

**Рэстаўра́цыя** – аднаўленне твораў мастацтва ў першапачатковым выглядзе.

**Святлаце́нь** – найважнейшы сродак выразнасці, спосаб перадачы аб’ёму прадмета з дапамогай ценяў і святла. Характар святлаценю залежыць ад формы і матэрыялу прадмета. Градацыі святлаценю:



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

святло, цень, паўцень. У асветленай частцы прадмета паказваюць блік, у ценявой – рэфлекс.

**Святло́** – у выяўленчым мастацтве градацыя святлаценю, найбольш асветленая частка паверхні прадмета.

**Сілуэ́т** – абрысы прадмета, падобныя да яго ценю. Від графічнай тэхнікі, плоскаснае аднатоннае адлюстраванне фігур і прадметаў на больш светлым або цёмным фоне.

**Скульпту́ра** – від выяўленчага мастацтва, творы якога маюць аб'ёмную форму. Скульптурныя творы выконваюцца з цвёрдых ці пластычных (мяккіх) матэрыялаў.

**Скульпту́ра ма́лых фо́рмаў** – невялікія скульптурныя творы, створаныя для ўпрыгожвання інтэр'еру. Да скульптуры малых формаў адносяцца жанравыя статуэткі, настольныя партрэтныя выявы, цацкі.

**Сюжэ́т** – падзея або з'ява, што адлюстроўвае мастак. У выяўленчым мастацтве сюжэтнымі з'яўляюцца творы бытавога, батальнага, гістарычнага і былінна-казачнага жанраў.

**Утыліта́рны** – прыкладны, вузка практычны.

**Факту́ра** – характар апрацоўкі паверхні матэрыялу.

**Цень** – градацыя (элемент) святлаценю асветленага прадмета. Цені бываюць уласныя і падаючыя. Уласны цень размяшчаецца ў слабаасветленай зоне прадмета. Падаючы цень знаходзіцца па-за



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

прадметам. Ён можа трапіць на натурны столік, фон і навакольныя прадметы.

**Штрых** – найважнейшы выяўленчы сродак у малюнку. Штрыхі бываюць рознай даўжыні, сілы, частаты, кірунку. Яны з'яўляюцца асноўным элементам графічнай работы.

**Экскурсаво́д** – спецыяліст па правядзенні экскурсій, той, хто паказвае наведвальнікам выстаўленыя для агляду экспанаты.

**Экспана́т** – прадмет, выстаўлены для агляду ў музеі або на выставе.

**Эскі́з** – папярэдні накід да карціны, малюнка. Эскізы могуць быць выкананыя ў рознай тэхніцы. Часцей за ўсё мастакі ствараюць некалькі эскізаў, а потым выбіраюць з іх найлепшы, які стане асновай будучага мастацкага твора.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Спіс выкарыстаных крыніц


С. 8. – Рэжым доступу: https://www.pinterest.pt/pin/245587604583311З/. – Дата доступу: 15.04.2018.

С. 9. – Рэжым доступу: https://ru.wikipedia.org/wiki/Пирамида_Джосера. – Дата доступу: 15.04.2018.

С. 10. – Рэжым доступу: http://mozyrisp.gov.by/ru/raion/view/v-liderax-mixalkovskaja-rudnja-6560/. – Дата доступу: 15.04.2018.

С. 13. – Рэжым доступу: http://kupalauski.by/performances/large_stage/paulinka/. – Дата доступу: 15.04.2018.

С. 14. – Рэжым доступу: https://commons.wikimedia.org/wiki/Category:Pesniary. – Дата доступу: 15.04.2018.

С. 15. – Рэжым доступу: https://es.wikipedia.org/wiki/Barranco_de_la_Valltorta. – Дата доступу: 15.04.2018.

С. 17. – Рэжым доступу: https://www.pinterest.com.mx/pin/181832903684463104/. – Дата доступу: 15.04.2018.

С. 17. – Рэжым доступу: https://www.sb.by/articles/planeta-slauk.html. – Дата доступу: 15.04.2018.

С. 20. – Рэжым доступу: http://artgallery.krasno.ru/IMAGES/Grafics/Vorobiova.htm. – Дата доступу: 15.04.2018.

С. 21. – Рэжым доступу: https://www.pinterest.com/pin/415738609343706594/. – Дата доступу: 15.04.2018.

С. 22. – Рэжым доступу: https://en.wikipedia.org/wiki/Steel_engraving. – Дата доступу: 15.04.2018.

С. 23. – Рэжым доступу: https://ru.wikipedia.org/wiki/Монотипия_(искусство). – Дата доступу: 15.04.2018.

С. 24. – Рэжым доступу: https://commons.wikimedia.org/wiki/File:%27Wheat_Field_and_Green_Hill%27_by_Edgar_Degas,_Norton_Simon_Museum.jpg. – Дата доступу: 15.04.2018.

С. 26. – Рэжым доступу: https://ru.wikipedia.org/wiki/Хруцкий,_Иван_Фомич. – Дата доступу: 16.04.2018.

С. 26. – Рэжым доступу: https://ru.wikipedia.org/wiki/Богатыри_(картина_Васнецова). – Дата доступу: 16.04.2018.

С. 27. – Рэжым доступу: https://en.wikipedia.org/wiki/J._M._W._Turner. – Дата доступу: 16.04.2018.

С. 27. – Рэжым доступу: https://fr.wikipedia.org/wiki/Jean-Baptiste_Camille_Corot. – Дата доступа: 16.04.2018.

С. 28. – Рэжым доступу: http://picassolive.ru/blog/pictures/pablo-pikasso-poet-1911/. – Дата доступу: 16.04.2018.

С. 28. – Рэжым доступу: https://ru.wikipedia.org/wiki/Мона_Лиза. – Дата доступу: 16.04.2018.

С. 30. – Рэжым доступу: https://ru.wikipedia.org/wiki/Эфес_(город). – Дата доступу: 16.04.2018.

С. 30. – Рэжым доступу: https://ru.wikipedia.org/wiki/Ника_Самофракийская. – Дата доступу: 16.04.2018.




Правообладатель Адукацыя і выхаванне

С. 32. – Рэжым доступу: http://www.art-catalog.ru/data_picture_2016/picture/1055/17133.jpg. – Дата доступу: 16.04.2018.
С. 32. – Рэжым доступу: http://allforchildren.ru/artenc/artist041.php. – Дата доступу: 16.04.2018.
С. 34. – Рэжым доступу: https://commons.wikimedia.org/wiki/Category:Jan_Davidsz._de_Heem. – Дата доступу: 16.04.2018.
С. 36. – Рэжым доступу: https://www.pinterest.com/pin/357825132868012584/. – Дата доступу: 16.04.2018.
С. 37. – Рэжым доступу: http://budzma.by/event/adkryccyo-vystavy-tvorau-vasilya-sharanhovicha. – Дата доступу: 16.04.2018.
С. 39. – Рэжым доступу: https://be.wikipedia.org/wiki/Ян_Матэйка. – Дата доступу: 16.04.2018.
С. 39. – Рэжым доступу: https://be.wikipedia.org/wiki/Геранім_Фларыян_Радзівіл. – Дата доступу: 16.04.2018.
С. 40. – Рэжым доступу: https://commons.wikimedia.org/wiki/Category:Alexey_Venetsianov. – Дата доступу: 16.04.2018.
С. 41. – Рэжым доступу: https://ru.wikipedia.org/wiki/Отдых_после_боя_(картина). – Дата доступу: 16.04.2018.
С. 42. – Рэжым доступу: https://be.wikipedia.org/wiki/Апошні_дзень_Пампеі. – Дата доступу: 16.04.2018.
С. 43. – Рэжым доступу: https://be.wikipedia.org/wiki/Грунвальдская_бітва_(карціна). – Дата доступу: 16.04.2018.
С. 44. – Рэжым доступу: https://ru.wikipedia.org/wiki/Файл:Дейнека_оборона_Севастополя.jpg. – Дата доступу: 16.04.2018.
С. 44. – Рэжым доступу: https://www.pinterest.cl/pin/255720085071806701/. – Дата доступу: 16.04.2018.
С. 46. – Рэжым доступу: https://ru.wikipedia.org/wiki/Алёнушка_(картина). – Дата доступу: 16.04.2018.
С. 46. – Рэжым доступу: https://ru.wikipedia.org/wiki/Пан_(картина_Врубеля). – Дата доступу: 16.04.2018.
С. 48. – Рэжым доступу: https://commons.wikimedia.org/wiki/File:Tikhobrazov_NI_-_Interior_1.jpg. – Дата доступу: 16.04.2018.
С. 49. – Рэжым доступу: https://commons.wikimedia.org/wiki/File:Былое._Комната_старого_дома._1912.jpg. – Дата доступу: 16.04.2018.
С. 50. – Рэжым доступу: https://commons.wikimedia.org/wiki/File:Frans_Snyders_-_Fable_of_the_Fox_and_the_Heron.jpg. – Дата доступу: 16.04.2018.
С. 51. – Рэжым доступу: https://ru.wikipedia.org/wiki/Заяц_(рисунок)#/media/File:Durer_Young_Hare.jpg. – Дата доступу: 16.04.2018.
С. 56. – *Починова, Н. В.* Белорусская народная декоративная роспись : [учебное пособие для профессионально-технического образования по специальности «Декоративно-прикладное искусство»] / Н. В. Починова. – Минск : Вышэйшая школа, 2005. – 175 с.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**(Назва і нумар установы адукацыі)**

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |


Вучэбнае выданне

**Шкуратава** Марыя Аляксандраўна
**Лукашэвіч** Юлія Аляксандраўна

# Выяўленчае мастацтва

Вучэбны дапаможнік для 4 класа ўстаноў
агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання

Для работы ў класе

Рэдактар *М. М. Шавыркіна*
Мастакі вокладкі *А. М. Новікаў, К. У. Максімава*
Мастакі *А. М. Новікаў, К. К. Шастоўскі*
Камп'ютарны набор *М. М. Шавыркіна*
Камп'ютарная вёрстка *К. К. Шастоўскі*
Карэктары *Н. А. Сячко, М. М. Шавыркіна*

Падпісана да друку 29.06.2018. Фармат 70 × 100 $^1/_{16}$. Папера афсетная.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 15,6. Ул.-выд. арк. 10,0. Тыраж 8700 экз. Заказ

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва "Адукацыя і выхаванне"».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/19 ад 14.11.2014. Вул. Будзённага, 21, 220070, г. Мінск.

Адкрытае акцыянернае таварыства «Паліграфкамбінат імя Якуба Коласа».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 2/3 ад 04.10.2013. Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, г. Мінск.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне